СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.46, 16.05, 8.19;
Віцебск — 7.41, 15.50, 8.09;
Магілёў — 7.35, 15.55, 8.20;
Гомель — 7.27, 15.57, 8.29;
Гродна — 8.02, 16.20, 8.18;
Брэст — 7.54, 16.29, 7.35.
МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 17 лістапада.
ІМЯНІНЫ
Апанаса, Нікандра, Нікана, Хведара, Валерыя, Яўгена, Кірыла.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

20 ЛІСТАПАДА 1992 г.
пятніца, № 233 (22011)

ВОЗГАЛАС

Аб тым, як у асобна ўзятым раёне Амерыцы «нос уціраюць», а за сваім прасачыць не могуць

СЛОНІМ. Асноўныя эканамічныя паказчыкі сельскай гаспадаркі раёна ў параўнанні з самымі перадавымі краінамі свету не толькі выглядаюць вельмі прыстойна, але нават і пераўзыходзяць іх. Так, у 1992 годзе на Слонімшчыне атрымана на душу насельніцтва збожжа 1.098 кілаграмаў, а ў ЗША—1.253. Адпаведна: бульбы —328 і 68, малака —600 і 269, мяса —178 і 123. Трэба сказаць, што сельскагаспадарчая вытвочасць раёна арыентуецца акрамя Беларусі і на рынак іншых краін СНД, і перш за ўсё Масквы і Санкт-Пецярбурга. Але яны ў апошні час аддаюць перавагу дапамозе замежных дзяржаў. У выніку гэтага ў Слонімскім раёне з мая гэтага года ператрымліваецца 5 тысяч галоў жывёлы, што ўжо нанесла страты мясцовым гаспадаркам на 90 мільёнаў рублёў.

Аб візіце беларускай урадавай дэлегацыі ў Рэспубліку Малдова

19 лістапада пачаўся афіцыяльны візіт у Рэспубліку Малдова беларускай урадавай дэлегацыі на чале са Старшынёй Савета Міністраў Вячаславам Кебічам. У праграме візіту — перагаворы з прэзідэнтам Малдовы Мірчам Снегурам, старшынёй парламента Аляксандру Машану і прэм'ер-міністрам Андрэем Сангелі, а таксама сустрэчы з работнікамі пастаяннага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова, прадстаўнікамі Беларускага культурнага таварыства, наведанне Фалешщкага раёна Малдовы.

Чакаецца падпісанне пагадненняў аб добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве паміж дзвюма краінамі, а таксама аб устанаўленні паміж імі дыпламатычных адносін.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь — БЕЛІНФАРМ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА СТАТЫСТЫЦЫ І АНАЛІЗУ

АБ ІНДЭКСЕ СПАЖЫВЕЦКІХ ЦЭН

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу паведамляе, што ў кастрычніку 1992 года ў параўнанні з вераснем 1992 года індэкс цэн на харчовыя і нехарчовыя тавары і паслугі, уключаныя ў «спажывецкую карзінку», склаў 111,0 працэнта. Індэкс спажывецкіх цэн за кастрычнік, вылічаны нарастаючым вынікам да чэрвеня 1992 года, прынятага ў якасці базіснага перыяду, склаў 157,4 працэнта.

У кастрычніку ў параўнанні са снежнем 1991 года кошт уключаных у мінімальную «спажывецкую карзінку» тавараў і паслуг узрос у 10,9 раза.

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу.

ПРАФСАЮЗНАЯ ХРОНІКА

Прэзідыум Савета ФПБ прыняў заяву ў сувязі з прапануемым чарговым павышэннем рознічных цэн і абмежаваннем росту заработнай платы. У ёй гаворыцца, што рэгуляванне, а не «замарожванне» заработнай платы можа быць ажыццёўлена толькі адначасова з абмежаваннем росту цэн, адменай падатку на дабаўлены кошт на асноўныя харчовыя тавары і медыкаменты, устанаўленнем фіксаванай надбаўкі да адпускной цаны прадпрыемства-вытворцы, вышэй за якую тавар не можа быць рэалізаваны спажыўцам. Прэзідыум Савета ФПБ лічыць, што далейшае пагаршэнне становішча працоўных недапушчальнае, становіцца рэальнай небяспека сацыяльнага выбуху.

Прэс-цэнтр Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

СУСТРЭЧА ПЕРАНОСІЦЦА

Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці, якая намячалася на 4 снежня, па іх узаемнай дагаворанасці пераносіцца на 18 снежня. Месца правядзення ранейшае — сталіца Рэспублікі Беларусь горад Мінск. Аб гэтым карэспанденту БЕЛІНФАРМа паведамілі ў мінскай штаб-кватэры СНД.

БЕЛІНФАРМ.

Разліковы білет супраць рубля: пачынаюцца баі мясцовага значэння

Прайшло дзесяць дзён, як расійскаму рублю на Беларусі быў нанесены адчувальны ўдар, калі «драўляныя» адсеклі ад харчовых тавараў, гарэлкі і цыгарэт. За гэты час многа вады сплыло, не менш, прабачце за каламбур, «сплыло» і рублёў з тэрыторыі рэспублікі, а таму «Звязда» працягвае знаёміць вас з апошнімі падзеямі на фронце барацьбы паміж арміяй «драўляных» і арміяй «звярыных».

Па рэдакцыйных каналах мы атрымалі звесткі аб урадавай тэлеграме, якую Камісія Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь са складанай назвай «па каардынацыі работы і аператыўнаму вырашэнню пытанняў паралельнага абарачэння рублёў і разліковых білетаў Нацыянальнага банка РБ» накіравала ва ўсе аблвыканкомы і абласныя ўпраўленні Нацбанка рэспублікі, у Мінгарвыканком і адпаведнае банкаўскае ўпраўленне, Аграпрамбанк і іншыя зацікаўленыя структуры. Калі перавесці змест тэлеграмы на зразумелую для шырокіх народных мас мову, то ён будзе выглядаць наступным чынам.

Па-першае, у залежнасці ад рэальнай абстаноўкі на месцах кампетэнтныя органы (аблвыканкомы і абласныя ўпраўленні Нацыянальнага банка) могуць цяпер самі прымаць рашэнні аб рэалізацыі асобных **нехарчовых тавараў толькі за разліковыя білеты** (выдзелена аўтарам) і чэкі з чэкавых кніжак РБ, патрабуючы пры гэтым дакументы, якія пацвярджаюць прыналежнасць пакупніка да нашай рэспублікі. Падругое, абмен разліковых білетаў на рублі і рублёў — на разліковыя білеты на месцах дазволена ажыццяўляць, улічваючы інтарэсы насельніцтва. Адначасова, з мэтай недапушчэння масавага вывазу тавараў, адпаведным органам рэкамендуецца ўзмацніць кантроль на дарогах і транспарце. Мэты з'яўлення гэтага дакумента, як бачна з самой тэлеграмы, самыя высакародныя — абарона мясцовага спажывецкага рынку ад скідвання рублёў з дзяржаў, якія выйшлі з рублёвай зоны. Відавочна, што ўрад перадаў рублёва-«зайцавыя» паўнамоцтвы мясцовым органам улады. А гэта значыць, што ў любы дзень (можа, нават і сёння) у Брэсце альбо Віцебску любы тавар будзе прадавацца толькі за разліковыя білеты, ды яшчэ пасля прад'яўлення пашпарта. Такім чынам, пачынаюцца «баі мясцовага значэння» і калі, напрыклад, у Гомелі вы зможаце за «драўляныя» набыць аўтамабіль, дык у Мінску рызыкуеце застацца нават без карабка запалак.

Вядома, што асобам, якія прыбылі на Беларусь не ў камандзіроўку, абмен рублёў на разліковыя білеты ажыццяўляецца з адпаведным 30-працэнтным камісійным зборам. І вось у апошні час з'явіўся новы від бізнесу. Цэлыя групы пасрэднікаў — жыхароў Беларусі за

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ПОСТФАКТУМ

Краіна, якая ніколі не будзе для нас «дальнім замежжам»

Мінск — першая са сталіц краін былога СССР, якую наведала новы прэм'ер-міністр Польшчы Ханна Сухоцка. Нават калі «першынство» гэта — выпадковасць, — усё роўна выглядае яно сімвалічна.

Нягледзячы на тое, што кіраўнікі Беларусі не раз заяўлялі аб прыярытэце для краіны арыенціраў, якія размешчаны за нашымі ўсходнімі граніцамі, — Польшча была і застанецца адным з галоўных партнёраў Беларусі. І не толькі ў эканоміцы. Нас звязваюць стагоддзі агульнага гістарычнага лёсу, а таксама этнічная і культурная блізкасць, якую ніяк нельга скідваць з рахункаў.

Цяжка ўявіць беларускую эканоміку без цеснай інтэграцыі з расійскімі сыравінкнымі крыніцамі. Але яшчэ цяжэй гаварыць аб будучыні, не наладжваючы сувязі з Захадам. У бліжэйшыя гады Беларусі міжволі давядзецца менавіта там шукаць і дзелавых партнёраў, і эканамічную падтрымку, і мадэлі свайго будучага развіцця. Непрадказальная Расія імкліва падае ў эканамічную бездань, цягнучы за сабой чатырнаццаць сіямскіх блізнят, у недалёкай будучыні пагражае разрадзіцца новымі палітычнымі і сацыяльнымі ўзрушэннямі. У гэтых умовах нам цяжка разлічваць на стабілізацыю. Наша краіна проста асуджана шукаць шляхі ў цывілізаваны свет, — аднабаковая арыентацыя на Усход мела б у бліжэйшыя гады катастрафічныя для Беларусі вынікі.

З пяці дзяржаў, з якімі Беларусь мае агульную граніцу, Польшча — адзіная, дзе крайні пункт эканамічнага крызісу пераадолены. У нашых заходніх суседзяў спынены спад у эканоміцы, а па выніках сёлетняга года чакаецца нават невялікі двухпрацэнтны рост. Падаюць тэмпы інфляцыі. Злоты стаў канверсуемай валютай. Паліцы магазінаў запоўніліся таварным дастаткам, — і зараз яны мала адрозніваюцца ад заходніх. У апошнім, найбольш наглядным выніку эканамічных рэформ тысячы грамадзян Беларусі пераконваюцца ўласнымі вачыма, наведваючы з «неафіцыяльнымі камерцыйнымі візітамі» польскія базары.

Нам яшчэ належыць прайсці гэты нялёгкі шлях. Беларуская эканоміка пакуль што коціцца пад гару. Сувязі з суседзямі, дзе новы гаспадарчы механізм пачаў даваць плён і эканоміка пайшла на папраўку, маглі б дабратворна паўплываць на нашу гаспадарку і змякчыць вынікі крызісу.

Мяркую, беларускае кіраўніцтва, ведучы перагаворы з польскай урадавай дэлегацыяй, мела на ўвазе перш за ўсё гэтыя інтарэсы.

Пакет дакументаў, падпісаных у Мінску, — сціплы. Найважнейшы з дагавораў — аб скасаванні падвойнага падаткаабкладання даходаў і маёмасці. Падобны дагавор з Масквой Варшава ўжо падпісала — днямі ён быў ратыфікаваны расійскім Вярхоўным Саветам. Пагадненне аблегчыць эканамічныя сувязі, скасуе лішнія звенні пры фінансавых разліках.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

СПЕЦЫЯЛЬНА ДЛЯ «ЗВЯЗДЫ»

У КДБ запахла новай фарбай. І новымі сенсацыямі аб карупцыі

У калідорах будынка Камітэта дзяржаўнай бяспекі рэспублікі стаіць моцны пах новай фарбы. Як мне растлумачылі, ідзе капітальны рамонт. Справа не частая, але патрэбная.

Яшчэ доўга будзе гучаць рэзананс, выкліканы выступленнем шэфа нашай службы бяспекі Эдуарда ШЫРКОЎСКАГА на сесіі Вярхоўнага Савета. Эдуард Іванавіч згадзіўся даць спецыяльнае інтэрв'ю нашай газеце.

— Чарговы залп вашага ведамства па карупцыі зроблены. Якія яго першыя вынікі?

— Я сустракаўся з членамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета, са Старшынёй нашага ўрада Вячаславам Кебічам, яго намеснікамі М. Косцікавым і М. Мясніковічам. Мэта сустрэч адна — як аб'яднаць намаганні ў барацьбе са службовымі злоўжываннямі і падняць грамадскасць для навядзення парадку. Больш трываць проста нельга. Да мяне, асабліва пасля выступлення на сесіі, прыходзяць дэлегацыі рабочых, сялян, інтэлігенцыі са сваімі сігналамі аб хабарніцтве і «бязмежжы» ўлад на самых розных узроўнях. Трэба вызначыцца ў стратэгіі і тактыцы барацьбы з гэтым спрутам, і чым хутчэй мы гэта зробім, тым лепш будзе для нас і нашай краіны.

— У грамадскіх незалежных камісіях, якія вы прапаноўваеце стварыць, некаторыя ўжо бачаць цень усёмагутных бескантрольных Надзвычайных камісій.

— Уся наша дзейнасць накіравана якраз на тое, каб нават і думка пра апошніх не прыходзіла нікому ў галаву. Пра іх бескантрольнасць нават і гаворкі весціся не можа. На мае меркаванне, ядром такіх камісій павінны стаць супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў. Мы са свайго боку таксама будзем дапамагаць. Галоўная мэта камісій відавочная — на месцах усё лепш і больш бачна людзям, якія там працуюць.

— Пасля першага чытання Закона аб КДБ і ў вашага ведамства з'явіліся большыя магчымасці для навядзення парадку?

— Мы фактычна існавалі па-за законам. Нас дзе-нідзе ўвогуле не прымалі ўсур'ёз. Напрыклад, затрымалі цыстэрну з бензінам без ліцэнзіі, якая накіроўвалася за межы рэспублікі. А ўладальнікі цыстэрны пытаюць: «А хто вы такія? Міліцыю ведаем, пракуратуру таксама, а вас пакуль на паперы ўвогуле не існуе».

Таму цяпер ужо можна спакойна і з большай упэўненасцю працаваць. Што новага хацелася б адзначыць у нашай дзейнасці, дык гэта тое, што мы цяпер стаім у першую чаргу на абароне правоў грамадзян, а ўжо потым — дзяржавы.

— Вы сказалі ў сваім выступленні на сесіі, што некаторыя дэпутаты, людзі, якія павінны абараняць інтарэсы дзяржавы, самі пападаліся на вельмі непрыгожых справах.

— Павінен яшчэ раз сказаць, што камітэт не можа сам караць ці прыцягваць да адказнасці народных выбраннікаў. Гэтым па закону павінны займацца вышэйшыя органы ўлады. Я неаднаразова даводзіў патрэбную інфармацыю і да Прэзідыума Вярхоўнага Савета, і да Саўміна. На чым пападаліся дэпутаты? На кантрабандзе, на іншых «непаразуменнях» з праваахоўнымі органамі.

— У небезвядомай 588-й пастанове Саўміна таксама называліся канкрэтныя прозвішчы некаторых службовых асоб. Аднак, наколькі мне вядома, большасць з іх атрымалі і атрымліваюць усяго толькі

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Першы крок беларускіх ваўчэраў?

Магчыма, з 1 ліпеня 1993 года ў Беларусі ўвойдзе ў сілу Закон «Аб імянных прыватызацыйных чэкавых кніжках у Рэспубліцы Беларусь».

Такі вывад маглі зрабіць прысутныя, якія прыйшлі на пасяджэнне Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па эканамічнай рэформе, дасягненню эканамічнай самастойнасці і суверэнітэту, дзе 18 лістапада абмяркоўваўся блок законаў па прыватызацыі.

Адразу скажам, што праекты законаў «Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці» і «Аб імянных прыватызацыйных чэках у Рэспубліцы Беларусь» вялікіх спрэчак на пасяджэнні не выклікалі і ў цэлым былі ўспрыняты станоўча.

Старшыня камісіі Леанід Козік азнаёміў з праектамі законаў, якія пасля перапынку будуць разгледжаны на сесіі.

Вядома, чытачоў у першую чаргу цікавіць пытанне, што яны будуць мець пасля прыняцця гэтых законаў. Можна адразу адказнача сказаць — прыватызацыйныя чэкі. Частку дзяржаўнай уласнасці па праекце мяркуецца бясплатна перадаць грамадзянам Беларусі ў выглядзе трох квот: на жыллё, зямлю, маёмасць дзяржаўных прадпрыемстваў і камунальнай гаспадаркі. Адзін чэк (адразу папярэдзім чытачоў, што лічбы прыводзіліся прыкладныя) роўны 0,17 квадратнага метра жылля, 0,2 га зямлі, або 819 рублям па дзяржмаёмасці ў цэнах 1991 года. Прычым мяркуецца, што чэкі будуць мэтавымі. Што гэ-

(Заканчэнне на 3-й стар.).

У зорачкі шанцаў мала...

Як паведамілі з прэс-цэнтра Міністэрства абароны, заканчваецца распрацоўка форменнага адзення для ваеннаслужачых беларускай арміі. Калі паляваа камуфляжная форма, адзіная для ўсёй арміі, сумненняў ні ў кога не выклікае, то штодзённая парадна-выхадная і парадная яшчэ будуць дапрацоўвацца з улікам нацыянальнай воінскай геральдыкі, якая павінна быць зацверджана парламентам рэспублікі. На думку распрацоўшчыкаў, шанц традыцыйнай зорачкі ўпрыгожваць форму беларускага ваеннаслужачага вельмі малы, паколькі многія звязваюць яе з камуністычным, таталітарным мінулым.

БЕЛІНФАРМ.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Аб карысці аўсянкі

Усе віды аўсяных круп пры разварванні ў вадзе ствараюць слізістую бялкова-крухмальную масу, якая ачышчае абалонку страўніка. Слізістыя адвары ахоўваюць страўнік ад іншай, яшчэ не ператраўленай, ежы, а самі добра засвойваюцца. Таму адвары з аўсяных круп прызначаюцца пры абвастрэнні язвеннай хваробы страўніка, дванаццаціперснай кішкі, гастрытах, калітах, харчовых атручэннях. Аўсяная каша дапамагае таксама выдаліць са страўніка свінец.

Слізістыя аўсяныя адвары выкарыстоўваюцца і пры малакроўі, якое ўзнікла з-за нястачы ў арганізме жалеза.

Аўсяныя крупы багатыя біяцінам, рэчывам, якое сінтэзуецца ў кішэчніку бясшкоднымі бактэрыямі, а частковa паступае з ежай. Недахват біяціну выклікае слабасць, санлівасць, кепскі апетыт, болі ў мышцах, губляюцца смакавыя адчуванні. Асабліва адбіваецца яго дэфіцыт у арганізме на скуры, якая становіцца сухой, лушчыцца, з'яўляюцца запаленні, выпадаюць валасы. Відаць, нездарма аўсянку называюць «кашай прыгажосці».

Гэтыя крупы — адна з крыніц і вітаміна Е, які з'яўляецца антыакісляльнікам, папярэджвае адкладанне халестэрыну, утварэнне тромбаў. Вітамін Е актывізуе работу мышцаў, ў тым ліку і сардэчнай, а яго нястача вядзе да бясплоддзя.

Ёсць спосаб лячэння гіпертанічнай хваробы ў пачатковай стадыі, а таксама пасля інфаркту міякарда. 1 шклянку аўса кіпяцяць у 1 л вады, пакуль вада не ўкіпіць удвая, працэджваюць і п'юць па 1/2 шклянкі ў суткі сталовымі лыжкамі.

Аўсяныя дні зніжаюць цукар у крыві. Асабліва карысная аўсяная каша пры абвастрэнні цукровага дыябету метабалічным ацыдозам. Для разгрузкі на дзень выкарыстоўваюць 200 г сухой аўсянай крупы ці геркулесу, з якіх гатуюць кашу без цукру на вадзе. Гэтую норму дзеляць на пяць порцый па 140 г.

Піццё — адвар шыпшыны. Такія ж разгрузачныя дні праводзяць пры хранічным запаленні нырак, нырковай недастатковасці.

Пра маслёнку

У абястлушчаным малацэ, сыроватцы, маслёнцы ўтрымліваюцца многія састаўныя часткі малака ў розных спалучэннях і колькасцях. Каларыйнасць маслёнкі невысокая, 33—36 калорый у 100 грамах. Але каштоўнасць яе не ў калорыях, а ў адносна павышаным утрыманні высокаактыўных у біялагічных адносінах рэчывах. У маслёнцы ёсць малочны цукар, бялок, мінеральныя рэчывы, тлушч, вітаміны А, В, Д, Е, біяцін, РР, халін, фасфацыды, якія рэгулююць клетачны абмен, у тым ліку лецыцін.

Лецыцін уплывае на працэс усмоктвання тлушчу, папярэджвае атлусценне печані. Яго нармалізуючае ўздзеянне на ўзровень халестэрыну ў плазмы крыві пацверджана шматлікімі назіраннямі.

Людзі пажылога ды і іншых узростаў, якія вядуць маларухомы лад жыцця, павінны атрымліваць лецыцін сістэматычна. Але не ўсім рэкамендуецца ўжываць у штодзённым рацыёне багатыя лецыцінам яечныя жаўткі, мазгі. А вось маслёнка для іх падыходзіць. У такой колькасці, як у маслёнцы, лецыціна-бялковыя комплексы ў іншых прадуктах не сустракаюцца.

Тое ж можна сказаць і пра тлушч маслёнкі. У параўнанні з тлушчам масла ён утрымлівае больш поліненасычаных тлушчавых кіслот, якія рэгулююць халестэрынавы абмен, умацоўваюць сценкі крывяносных сасудаў і засцерагаюць печань ад атлусцення.

Малочны цукар — лактоза — садзейнічае развіццю малочнакіслай мікрафлоры ў кішэчніку, што папярэджвае і стрымлівае развіццё гніласных працэсаў. Дыетычны тварог з маслёнкі, багаты бялком, лецыцінам і іншымі карыснымі рэчывамі, і кісламалочныя напіткі пажаданыя ў харчаванні людзей пажылога ўзросту і разумовай працы. Кісламалочныя напіткі, асабліва сквашаныя культурамі ацыдафільнай палачкі, дапамагаюць пры страўнікава-кішачных захворваннях.

Маслёнку выкарыстоўваюць у дыетычным харчаванні. Яе ўжываюць, калі неабходна абагаціць рацыён бялком без павелічэння калярыйнасці і ўтрымання тлушчу пры дыспепсіі і іншых страўнікава-кішачных парушэннях.

Маслёнка і прадукты з яе рэкамендуюцца пры некаторых захворваннях печані, нырак і нервовай сістэмы, а ў шэрагу выпадкаў — для лячэння скурных захворванняў. Ва ўніверсітэцкай клініцы горада Фрэйбурга (ФРГ) маслёнка «Эледон» у выглядзе канцэнтрату прымяняецца для лячэння лускаватага лішая (псарыязу) і як дадатковы тэрапеўтычны сродак выкарыстоўваецца пры дыспепсіі, пры атэрасклерозе і кальцынозе.

(Па матэрыялах часопіса «Наука и жизнь»).

ДАЎРАЧЭБНАЯ ДАПАМОГА

Галавакружэнне неўралагічнае

Яно часам суправаджаецца падзеннем або млоснасцю і ванітамі. Іншы раз бывае прадвеснікам эпілепсічнага прыпадку. Узнікае пры раздражненні сувязей унутранага вуха з карой галаўнога мозгу або пры іх пашкоджанні. Гэта бывае звязана з неўрозамі, хваробай Меньера, мігрэнню, неўрытам слыхавога нерву, ваганнямі артэрыяльнага ціску, шыйным астэахандрозам, дыфузным таксічным валляком, атручваннем, малакроўем.

Асабліва моцныя галавакружэнні звязаны з запаленнем галаўнога мозгу, траўмамі чэрапа, пухлінамі галаўнога мозгу, рассеянным склерозам. Нярэдка развіваюцца пры парушэнні мазгавога кровазвароту пры цукровым дыябеце, атэрасклерозе мазгавых сасудаў, ішэмічнай хваробе сэрца.

АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ пры раптоўным галавакружэнні, якое суправаджаецца як правіла, шматразовымі ванітамі, збялеласцю ці пачырваненнем твару, патлівасцю, сэрцабіццём, змяненнем слыху ці зроку, хвораго неабходна пакласці і прымусіць яго ляжаць, не рухаючыся.

Паспрабуйце ліквідаваць крыніцы шуму і святла, прыкрыўшы чым-небудзь мяккім галаву і закрыўшы вокны. Калі прыступ галавакружэння развіваецца разам з галаўным болем і не суправаджаецца ванітамі, хвораму неабходна прыняць таблетку цытрамону, аскафену, новаміграфену, спазмалгону ці кафетаміну або іншае лякарства, назначанае раней урачом з выпадку падобнага прыступу.

Калі пасля гэтага самаадчуванне не палепшылася або калі прыступ галавакружэння ўзнік упершыню, неабходна выклікаць «хуткую дапамогу».

Таццяна ФАМІНА, кандыдат медыцынскіх навук.

Ласьёны нашых прабабак

Добра дзейнічаюць на скуру ласьёны хатняга вырабу.

Святаянник, падбел, крываўнік, шалфей змяшаць у роўных частках. Сталовую лыжку гэтай сумесі заварыць шклянкай кіпеню (у шкляным ці эмаліраваным посудзе), шчыльна закрыць, ухутаць і пакінуць на ноч. Раніцай працадзіць, змяшаць адвар з 50 г адэкалону—і ласьён гатовы. Ён выкарыстоўваецца ў спякоту для патлівай, тлустай скуры. Адвар (без адэкалону) можна замарозіць у формачках для лёду і кавалачкамі яго праціраць скуру твару раніцай.

Для такога ж тыпу скуры падыходзіць і наступны ласьён: настой з кары дубу і вярбы (па чайнай лыжцы на 200 г вады) змяшаць са сталовай лыжкай воцату і развесці вадой у суадносінах 1:10. Праціраць, а ў спякоту—апаласкваць твар.

Сумесь траў (у роўных колькасцях)—плюшчу палявога, браткоў, наготкаў, рамонку і дубовай кары здрабніць. Сталовую лыжку сумесі заліць кіпенем, прагрэць 10—15 хвілін, даць настаяцца, працадзіць. Такім адварам добра праціраць любую скуру, якая пачынае старэць.

БЕЛАРУШЧЫНА

АБРАЗОК ЧЫТАЧА

Чэмпіёнка

Гэты ліст, падпісаны жаночым імем, прыйшоў у рэдакцыю з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна. Для многіх сяброў беларушчыны будзе дастаткова такой згадкі, каб раскрыць тайну псеўданіма. Мы не будзем рабіць гэта... прамалінейна. Проста скажам, што якраз у такім выпадку для нас важная спасылка на моўны выбар вядомага гудзевіцкага настаўніка-асветніка Алеся БЕЛАКОЗА.

Вы зможаце заўважыць, што арфаграфічна нататка афармлена ла тых правілах, якім падпарадкоўваюцца фальклорныя запісы. Яны павінны як мага больш дакладна захоўваць асаблівасці мясцовага маўлення. І тут дасведчаны аўтар не змог абысціся без мяккага знака...

Некалькі гадоў не была ў роднай вёсцы. І вось нарэшце як на крыллях лячу. Першую сустракаю бабулю Марыльлю, ці, як яе называюць часам у нашай вёсцы, Чэмпіёнку. Бабулі больш за дзевяноста, а яна з рыдлёўкай у руках корпаецца на асфальце. Вітаюся і цікаўлюся, што яна робіць тут з рыдлёўкай. Бабуля Марыля зажаніліася, амаль плача, нават некалькі слязінак скацілася па ссохлай маршчыністай шчацэ:

— Шкадую, што машыны разбіваюцца. Чамусьці тут асфальт перакапалі, то раўчук упоперак дарогі зьявісо. Раўнюю і прысыпаю кожаняк дзень, а як машына ідзе, то сцішае ход: мусі калдобіны застаюцца.

— Роўна ж тут, бабулю. Чаго вы хвалюецеся? Машыны сьцішаюць ход, бо бачаць, што насыпана сьвежая зямля.

— А-а, мусі твая праўда, бо Мікалай Мініч тут часта ездзіць, то нясецца, як бура, і нічога.

— Ці ж вам рамантаваць дарогу? Хай бы маладзейшыя папрацавалі тут.

— У іх свае справы, а як не прысыпаць равок, то і бяда можа стацца.

Дзякую вам, бабуля, што так дбаеце пра людзей!

Я падбегла да бабулі Марылі і знянацку для яе і для сябе, бо не збіралася гэтага рабіць, моцна-моцна пацалавала яе ў шчаку. Пасля гэтага з нейкай палёгкай пабегла дахаты, да мамы.

Не буду апісваць, колькі радасці было нам ад сустрэчы, але назаўтра я расказвала пра сваты ўчынак Марылі Шантарыхі.

— Ой, дзетанкі, — падхапіла мама, — яе ж нашы маладыя за дурную лічаць: убачыла каля школы разбітую бутэльку, то сабрала ўсе асколкі шкла ў прыпол і каля хаты высыпала ў дзіравую жалезную бочачку: кажа, што шкло пабітае дзяржава павінна зьбіраць і пераплаўляць на добрае, бо гэта ж людская праца. І прымаць яго мус, бо дзеці ці набытак могуць пакалечыцца. Нават настаўнікі сьміюцца зь яе: «Дзеці ў нас босыя ні ходзяць, а кароў каля школы ні бывае» — думаюць, што яна шкло зьбірае з-за скупасьці, а Марыля жабракам усю пенсію параздае. Цяпер яна, як падымае камень які з дарогі ці шкло або дрот, та азіраецца, каб ніхто ні бачыў: сьміцца будуць.

У Настулі Кісялёўскай, як тая нагу паламала, выбрала ўсю бульбу, хоць і ў самой ногі баляць, ледзьве ходзіць. Настуліну гаспадарку ўпраўляла. Як ёсьць сьвятыя, то гэта Марыля. Такіх людзей ужо амаль няма.

— Маму, а чаму яе называюць Чэмпіёнкай?

— Як прыйшла з турмы, та людзі пыталіся, за што сядзела, а яна адказвала:

— Сьледчыя казалі, што я нека чэмпіёнка, бо ад цёткі з Амэрыкі пісьмо атрымала.

— А за што арыштавалі ў трыццатых яе мужа, дзядзьку Мікалая?

— У час вайны наталі на іх бандыты; абрабаваць хацелі. Хоць зямлі ў іх было небагата, але яны ўсё мелі, бо надта старанныя абоя.

— То ці абрабавалі іх тады?

— А як жа. Усенько забралі. Нават матке на кужаль якраз выварыла ў лузе цётка Марыля, памыла ў рацэ і на гарышчы павесіла сушыцца, бо тады неяк дажджы часта падалі, то і матке тыя забралі. Хлапчук гадоў чатырнаццаці сказаў бацьку:

— Тату, забіраймо матке, бо мама казала, каб і іх бралі.

— Каб ты, сынок, здароў знасіў тую кашулю, што маці вытча з крадзеных маткоў, — толькі і пажадала Марыля.

— Маўчы, бо застрэлю, — кляцнуў затворам абрэза хлапчук.

Пры другіх саветах гэтыя бандыты назваліся партызанамі і былі вялікімі начальнікамі. Вось яны і пасадзілі дзядзьку Мікалая. Там ён і загінуў.

...Цяпер праводзяць людзі, асабліва начальнікі, ваду, тэлефон, газ. Шмат дзе перакапаны асфальт. Няхай бы і маладзейшыя ўзялі прыклад з бабулі Марылі. Бо адзін мой знаёмы начальнік, якому нядаўна праводзілі тэлефон і пракапалі асфальт супраць ягонай хаты, на маю заўвагу пра роў адказаў:

— Яго не закапаеш: машыны зноў выб'юць.

Нешта каля хаты бабулі Марылі і асфальт, і перакапаны роў эраўняліся і гладкія, як шкло.

Алена ГРАМАДА.

СВЯТЫЯ МЕСЦЫ

НА ЗДЫМКУ: Святапетрапаўлаўскі сабор у Мінску. Пачатак XX стагоддзя.

Сабор на Нямізе

Сярод храмаў Мінска, што захаваліся па сённяшні дзень, сваю адметную гісторыю мае Святапетрапаўлаўскі (Святакацярынінскі) сабор, які месціцца ў раёне былога Ніжняга Рынку, дзе калісьці працякала славутая Нямігa. Сціснуты з аднаго боку новазбудаваным каменным гмахам і шчыльна абмежаваны з другога боку бойкай вуліцай, гэты храм паступова аднаўляецца з небыцця мінулых гадоў; нягледзячы на ўсё перажытае ў далёкім і блізкім мінулым, адраджаецца для таго, каб зноў несці людзям свет любові і дабра. Аб чым жа можа расказаць нам яго гісторыя, якія падзеі захоўваюцца ў яе таямніцах!

Заснавана Святапетрапаўлаўская царква была на пачатку XVII стагоддзя праваслаўнымі жыхарамі Мінска на пляцы, што выдзеліла для іх князёўна Друцкая-Горская, удава каралеўскага маршалка Багдана Сцяткевіча. Будаўніцтва новага храма ў горадзе было звязана з тым, што пасля заключэння Берасцейскай уніі 1596 года мясцовыя уніяты адабралі ў праваслаўных усе цэрквы, якія належалі ім спрадвеку. Таму, застаўшыся без малітоўнага памяшкання, апошнія вымушаны былі прыступіць да ўзвядзення новай святыні. Пры гэтым яны вырашылі пабудаваць не толькі царкву, але і манастыр. 52 шляхцічы і мешчаніны Мінскага ваяводства бралі на сябе абавязак узвядзення цэлага храмавага комплексу, які б падначальваўся Віленскаму Святадухаву манастыру, буйнейшаму асяродку праваслаўя на Беларусі. Праз некаторы час храм святых апосталаў Пятра і Паўла і манаскія келлі былі пабудаваны. Па блаславленню Іерусалімскага Патрыярха Феафана пры новай царкве ўтварылася праваслаўнае брацтва, названае ў імя Св. Іаана Хрысціцеля. Народ аб'ядноўваўся ў брацтвы, каб лягчэй бараніцца ад уціску з боку уніятаў і каталікоў. Самае першае брацтва ў Мінску ўзнікла яшчэ на пачатку 90-х гг. XVI ст. пры царкве нараджэння Багародзіцы, што стаяла ў замку. Звычайна пры брацтвах ствараліся школы, адчыняліся друкарні і шпіталі. У хуткім часе і брацтва Св. Іаана Хрысціцеля займела сваю школу, адкрыла шпіталь.

У гаротныя часы ганенняў на праваслаўе, выпаўшыя на XVII ст., Святапетрапаўлаўская царква не раз з'яўлялася сведкай несправядлівасцяў, якія спаткалі «люд веры грэчаскай». Невыпадкова ў 1619 г. мінская праваслаўная шляхта скардзілася ў Літоўскі Трыбунал на зняважлівыя адносіны да іх царквы ваяводы Мінска Пятра Тышкевіча, які «нарушаючи право и волности шляхецкие... наступаючи на сумнення людскія и на веру старожитную греческую» перашкаджаў заканчэнню будаўніцтва манастыра, нават выказваў намер зруйнаваць яго ушчэнт. Намеры яго, аднак, не спраўдзіліся...

У 1632 г. замест нецярпімага да іншаверцаў езуіцкага караля Жыгімонта III на польскі трон узышоў Уладзіслаў IV. Па яго ўказцы ў Рэчы Паспалітай былі прыняты «Статьи для успокоения народа русского греческой религии...», якія троху аблегчылі становішча праваслаўя на Беларусі.

«Статьи...» Уладзіслава IV не на доўгі час палепшылі міжканфесійныя адносіны ў Рэчы Паспалітай. Ужо з канца XVII стагоддзя Святапетрапаўлаўская царква разам з манастыром паступова прыходзіць у заняпад. У 1691 г. архімандрыт манастыра Пётр Пашкевіч на працягу трох сутак быў вымушаны бараніць царкву ад узяўшых яе ў аблогу уніятаў на чале з плебанам Салганам Юрэвічам. У 1722 г. манастыр не вытрымаў часовай аблогі і быў разрабаваны людзьмі Міхаіла Глінскага. Але самае жахлівае адбылося 10 лютага 1734 г., калі ў царкву ўварваўся натоўп мінскіх канфедэратаў, пры гэтым паны Сэзсновіч і Унгер заехалі ў храм вярхом на конях і з ружжаў сталі паліць па алтару і абразах. Пасля гэтага нападу манастыр збяднеў канчаткова.

Бядотнае становішча Святапетрапаўлаўскай царквы прыцягнула ўвагу да яе рускай імператрыцы Кацярыны II. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі, у 1795 г. Святапетрапаўлаўскі храм быў перайменаваны ў імя святой велікапакутніцы Кацярыны. Пад гэтаю назваю ён таксама ўвайшоў у гісторыю.

У перыяд з 1795 па 1799 гады Святакацярынінскі храм быў кафедральным саборам Мінскай епархіі, але потым быў ператвораны ў звычайную прыхадскую царкву.

Небагатая неабходным начыннем, Святакацярынінская царква на пачатку XIX ст. атрымала значныя ахвяраванні ад прыватных асоб. Адзін толькі купец Іван Ракаў падараваў ёй розных царкоўных рэчаў коштам у паўтары тысячы рублёў. На жаль, у 1812 годзе храм зноў пацярпеў ад рабаўніцтва. Заняўшы Мінск, французы спустошылі яго так, што набажэнства ў ім адрадзілася толькі праз два гады пасля вызвалення горада ад напалеонаўскіх войскаў. Пакуль жа храм прыводзіўся ў належны выгляд, службы праводзіліся ў адзінай прыпісной да яго царкве Св. Марыі Магдаліны на Старажоўскіх могілках.

У 1844 годзе прыход Святакацярынінскай царквы значна пашырыўся, бо да яе прыпісалі сяленні і асобныя гарадскія кварталы, якія дагэтуль уваходзілі ў прыход драўлянай Св. Уваскрасенскай царквы, што была зачынена з прычыны свайго ветхага становішча. Пасля гэтага царква на Нямізе набыла статус гарадскога сабору.

На самым пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя Святакацярынінскі сабор рамантаваўся і быў перабудаваны. Над яго асноўным аб'ёмам узвялі вялікі купал і поўнасцю абнавілі іканастас, тады зрабілі роспіс асобных фрагментаў сцен. Усяго на адзначаныя работы затрацілі каля 2 тысяч рублёў.

Цяжкія выпрабаванні спаткалі служыцеляў і вернікаў сабору пасля рэвалюцыі 1917 года. Мы не шмат ведаем пра тыя часы. Да 1933 года сабор усё яшчэ быў адчынены. Храм на Нямізе зачынілі глыбокай восенню 1933 года. Тады ж былі зарыштаваны епіскап Філарэт і служыўшыя яму святары. Вясною 1938 года з сабору знялі вялікі купал, а ў яго памяшканнях размясцілі нейкія гандлёвыя канторы. На доўгія восем гадоў у храме спынілася богаслужэнне.

Вернікі зноў адкрылі сабор узімку 1941 года. 7 снежня епіскап Філафей Нарко занава асвяціў храм, на гэты раз у гонар святых апосталаў Пятра і Паўла. Пад час вайны ў царкве служыў а. Іосіф Балай. Пасля вызвалення горада ад немцаў у снежні 1944, сабор зачынілі...

З тых часоў прайшло 46 гадоў. Спачатку храм стаяў у запусценні, потым у ім размясціліся архіўныя ўстановы. І толькі нядаўна Святапетрапаўлаўскі сабор адкрыў свае дзверы для вернікаў. 7 снежня 1991 года ў саборы на Нямізе была адслужана першая ў пасляваенны час літургія. На ўрачыстай службе прысутнічаў мітрапаліт Мінскі і Беларускі Філарэт. Людзі плакалі ад радасці, калі ішло тое гістарычнае набажэнства.

Сёння старажытнейшы праваслаўны храм Мінска аднаўляецца. Як і сотні гадоў назад, у ім гучаць святыя словы малітвы, на чале з настаяцелем храма прот. Георгіем Латушкам дзейнічае нядзельная школа, пры царкве ўтворана брацтва імя Трох Віленскіх пакутнікаў.

Хведар КРЫВАНОС.

Мова мая, мова

Не магу заставацца ўбаку, чуючы і назіраючы тое, што робіцца вакол нашай Мовы. Мой пратэст, маё абурэнне, мой адчай—у гэтым трыпціху. Хачу, каб яго пачулі менавіта зараз, менавіта праз вашу газету.

Соф'я ШАХ

Трыпціх

1.

Мова мая, Мова,
як жа табе выжыць!!
Зноў цябе нервова
шморгаюць, мурыжаць.

Зноўку распінаюць
вэрхалам неновым,
зноўку вырашаюць
лёс твой пальмовы.

Так ужо ўзяліся
выпятаць высновы,
так ужо зайшліся
гвалтам тэрміновым...

З'едлівыя душы,
цьмяныя галовы...
Ну няўжо не здужыш
наступ іх чарговы!!

2.

Як ім цяжка зразумець,
як няўцямна ўрэшце ім,
што табе прастору мець
Богам дадзена самім.

Што ў цябе з глыбінь вякоў,
і цяпер, і там, пасля,
ёсць і будзе зноў і зноў
Гэта існая зямля.

3.

Мая ласкавая, пяшчотная,
мая да саменькага «я»,
дасць Бог, дарогаю свабоднаю
зноў стане доля-каляя.

Дасць Бог, і тыя шчэ
спахопяцца,
і вернуцца шчэ да цябе,
што так цяпер пагардай
томяцца,
Так насміхаюцца цяпер.

Дасць Бог, не будзеш ты ім
ношаю, —
спасцігнуць, можа, назаўжды.
якая ж ты сабой прыгожая,
якая велічная ты...

Што пакуль жыве народ, —
так, народ, а не ізгой,—
нават і ў часы нягод
ты — галоўная на ёй!

ГАЛАСЫ ДЫЯСПАРЫ

ВАЛЯНЦІН ГРЫЦКЕВІЧ:

«Ініцыятыва павінна зыходзіць ад роднага краю»

Наша гутарка з Валянцінам ГРЫЦКЕВІЧАМ, гісторыкам, медыкам, філолагам, актыўным дзеячам беларускага руху, дацэнтам Санкт-Пецярбургскага інстытута культуры, адбылася ў Ваенна-медыцынскім музеі горада на Няве, дзе ён адказвае за дарэвалюцыйны аддзел экспазіцыі па гісторыі медыцыны. Пачалася гутарка з пытання, якое найбольш хвалюе тых, хто па волі лёсу апынуўся далёка ад Радзімы.

— Валянцін Пятровіч, як вы лічыце, каму павінна належаць ініцыятыва ў наладжванні сувязей паміж беларускай дыяспарай у свеце і Беларуссю?

— Зразумела, роднаму краю. Бо самі суполкі, як і кожны жывы арганізм, могуць перажываць узлёты і падзенні ў сваім развіцці, а галоўнае —не маюць таго асяродку штодзённасці, які не дазволіў бы страціць адчуванне Адраджэння. І, што казаць, не маюць магчымасці атрымаць матэрыяльную падтрымку. Зусім натуральным мне здаецца ўтварэнне цейкай дзяржаўнай арганізацыі, накшталт камісіі ці падкамісіі Вярхоўнага Савета па справах дыяспары, бо, скажам, згуртаванне «Бацькаўшчына» ці Скарынаўскі цэнтр — гэта ўсё ж ініцыятыўныя грамадскія арганізацыі, а ў адносінах да дыяспары неабходна будаваць дзяржаўную палітыку не на год ці два, а на дзесяцігоддзі. Ці ж суседнія з Беларуссю краіны не займаюцца справамі дыяспары на афіцыяльным узроўні? Няўжо Беларусь павінна адставаць ад іх у гэтым?!

— Як вядома, Пецярбург быў калыскай духоўнага адраджэння і духоўнага росту многіх беларусаў, якія мелі тут прытулак, напрыклад, Кастусь Каліноўскі ці Янка Купала. Не прыніжаючы ролі іншых грамадскіх і культурных дзеячаў мінуўшчыны, якія спрыялі росту свядомасці беларускай нацыі, спынімся пакуль толькі на адным факце — на існаванні ў Пецярбурзе беларускай суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца». Ці можаце Вы правесці нейкія паралелі паміж дзейнасцю суполкі, якую Вы ўзначальваеце, і суполкай Купалы і Эпімах-Шыпілы?

— Аднавіць традыцыі колішніх пецярбургскіх гурткоў было б вельмі карысным, але для гэтага патрэбна падтрымка беларускіх эканамічных колаў. Тады можна было б разлічваць на нейкі рэальны, канкрэтны вынік. А накопт паралеляў, то, здаецца, і наша суполка мае неблагія творчыя гуманітарныя сілы, якія робяць адчувальны ўклад у развіццё беларускага мастацтва і літаратуры, спрыяюць пашырэнню гуманітарных ведаў. Дай Божа і надалей развіваць гэту традыцыю.

— А чаму «дай Божа»? Вас нешта засмучае ў гэтых адносінах?

— Засмучае недастатковая, каб не сказаць «ніякая», матэрыяльная база нашага таварыства, без якой — асабліва ў наш пераменлівы час — нельга ўвасобіць у жыццё аніякай з'явы духоўнай культуры. Пакуль што мы не маем спонсараў. Мо таму, што дрэнна шукаем іх?

— А якія падзеі, вартыя ўвагі, можаце Вы пералічыць, што можна было б без усялякіх скідак запісаць у актыў дзейнасці таварыства?

— За апошні час я назваў бы выхад у свет газеты «Родзічы» і, зразумела, уздзвіжэнне на Левашоўскай пусташі — Пецярбургскіх Курапатах — памятнага крыжа ахвярам таталітарызму па ініцыятыве сябра БГКТ Анатоля Разумава. Гэтыя дзве падзеі з'яўляюцца пэўным этапам у дзейнасці суполкі і сведчаць пра яе сталасць.

— А ў планах на будучае? Што цікавае чакае пецярбургскіх беларусаў — сяброў суполкі, — а таксама тых беларусаў, якія жывуць на Беларусі?

— У першую чаргу спадзяёмся на склікание беларусазнаўчай канферэнцыі ў горадзе на Няве, якую рыхтуе сябра БГКТ Мікола Нікалаеў, а таксама выстаўку групы мастакоў Балтыі «Маю гонар».

— Валянцін Пятровіч, а ці часта Вы самі бываеце на Беларусі? Ці дае яна імпульс для Вашай творчай працы?

— На жаль, радзей, чым хацелася б. А пра імпульс — ці ж могуць тут быць якія сумненні?!

— А ці згадзіліся б Вы трывала жыць на Беларусі? І калі не, то чаму?

— Чаму ж — «не»? Калі б я бачыў, што дзяржаўныя колы ўсур'ёз зацікаўлены ў сапраўднай беларусізацыі гістарычнай навукі і адукацыі ў родным краі, я з ахвотай прыняў бы ў гэтым удзел, хоць наездамі, хоць трывала. Але пакуль што не бачу гэтай зацікаўленасці амаль нідзе, у прыватнасці, і з боку міністэрства адукацыі, бо для рэфармавання гістарычнай навукі і адукацыі патрабуецца нешта большае, чым тое, што робіцца цяпер. Робіцца мала, і праз тое складаецца ўражанне, што шмат хто спадзяецца на тармажэнне развіцця беларускай гістарычнай навукі, на захаванне ў ёй старых русіфікатарскіх несамастойных стэрэатыпаў, міфаў, легенд. Гэткае становішча задавальняе шматлікія кадры выхаванцаў колішняй, наскрозь саветызаванай навукі, бо ім у такім выпадку няма патрэбы мяняць свае далёкія ад аб'ектыўнасці погляды на беларускую мінуўшчыну.

— Валянцін Пятровіч, але пасля гэткіх Вашых адказаў складаецца нейкае дзіўнае, нават дваістае ўражанне, нібыта не толькі Вы, але, пэўна, і ўсе мы прымацаваны да нейкага маятніка, які гайдаецца то туды, то сюды. З аднаго боку — уздым, адраджэнне, а з другога — мо і нябачны пакуль, але ўжо адчувальны песімізм, цемра, безвыходнасць. Ці не памыліўся я ў гэтым адчуванні, і ці мае яно пад сабой нейкую падставу?

— Падстава зусім рэальная, а я, будучы гісторыкам, ніколі не вызначаўся танным аптымізмам. Ці ж мы не ведаем, што жыццё ставіць перад намі пытанні, на якія ці няма адказаў, ці адказы гэтыя — маласуцяшальныя? Адно з гэткіх пытанняў — аб сэнсе жыцця. Тыя адказы, якія мы маем, усё яшчэ з вялікімі пытальнікамі. І ўсё ж — таму, што мы людзі, — даводзіцца рабіць усё, каб пераадолець бессэнсоўнасць, абсурд, знайсці сваё прызначэнне і месца ў гэтым свеце.

— Вашы пажаданні чытачам «Звязды»?

— Хацелася б пажадаць і сабе, і іншым быць больш спагадлівымі і ўважлівымі да тых, хто жыве побач з намі.

— А яшчэ, не спыняцца на тым, што ўжо зроблена, і прыкладаць усе сілы, каб мы зноў адчувалі сябе беларусамі!

Гутарыў Анатоль КІРВЕЛЬ.
г. Санкт-Пецярбург.

ЗРАБІ САМ

Дыпламат-столік



а) 1— створкі; 2— ручка; 3— ножкі; 4— месца пад радыёпрыёмнік.

б) 1— шарнір; 2— штыры мацавання; 3— вушкі для мацавання.

Для дыпламата патрэбны дошкі 10-12 мм для вырабу каробкі. Для ножак спатрэбіцца фанера —10 мм. Усё астатняе відаць на малюнку.

Капрызныя дзверы

Што рабіць, калі дзверы заўсёды скрыпяць?

В. КАРАЛЕНКА.

г. Добруш.

Скрыпучыя дзверы, гэта, канешне, непрыемна. Аднак справу можна паправіць. Крыху прыўзніміце з дапамогай малатка, сякеры або металічнага лома, а петлі змажце машынным маслам ці свіным тлушчам. Пасля гэтага некалькі разоў адкрыйце і закрыйце дзверы, пакуль змазка не размяркуецца па восях петляў. Потым дзверы апусціце і прывядзіце ў нармальны стан.

Калі дзверы «заядаюць», то перш за ўсё трэба праверыць, ці добра яны закрываюцца. Магчыма, яны проста чапляюць падлогу. У такім выпадку дастаткова проста падняць іх на 1—2 міліметры, надзеўшы на восі петляў металічныя шайбачкі. Калі няма шайбачак, можна замяніць іх дротам з цвёрдага сплаву, які трэба наматаць на металічны стрыжань дыяметрам, роўным дыяметру пятлі.

Парады на ўсякі выпадак

Вам трэба адрамантаваць водаправодны кран у кухні, а ўваходны вентыль трымае слаба. Адкрыйце кран у ваннай, потым няспраўны ў кухні выкруціце, а гняздо хутка закрыйце коркам ад бутэлькі. Вада будзе сцякаць у ванну. Пасля рамонту выміце корак і закруціце кран на месца.

***

Здараецца, што пры зачыненых дзверцах халадзільніка лямпачка ў ім не гасне — кароткая кнопка выключальніка. Надзеньце на кнопку кавалак гумавай трубкі — ён павялічыць яе даўжыню.

***

Як адрамантаваць спіраль праса і іншых награвальных прыбораў — ведаюць усе. Аднак на месцы залучэння з-за дрэннага кантакту спіраль перагарае зноў. Есць парада ў вопытных гаспадароў. Зрабіце з бляхі невялічкую пласцінку 6х6 мм, сагніце пласціну пласкагубцамі. Вось цяпер рамонт закончаны.

***

Зморшчаныя, каляныя скураныя пальчаткі пратрыце чыстай анучкай, намочанай у касторавым масле. Праз некалькі гадзін яны стануць эластычнымі і бліскучымі.

***

Калі язычок чаравіка не трымаецца на адным месцы, зрабіце ў ім дзве невялікія дзіркі: прапушчаны праз іх шнурок дазволіць замацаваць язычок чаравіка ў патрэбным становішчы.

І шкло не падрапаецца...

Акенца індыкатара ў камп'ютэрах, дазіметрах, іншых прыборах звычайна робіцца з пластмасы. Але з цягам часу, як бы старанна ні абыходзіліся з прыборам, яно пакрываецца дробнымі і нават буйнымі драпінамі. А гэта перашкаджае нармальна счытваць паказчыкі з прыбора.

Каб пазбегнуць драпін, можна на гэтае акенца наклеіць тонкую празрыстую плёнку або стужку, стараючыся, аднак, каб клей не трапіў на акенца. Практычна не перашкаджаючы рабоце з прыборам, плёнка захоўвае акенца ад пашкоджання.

З цягам часу сама плёнка можа пашкодзіцца. Але яе замяніць, вядома ж, прасцей, чым акенца.

Пераносная вяндлярня



Вяндлярню, якую вы бачыце на малюнку, вырабляе адзін з заводаў у Мардовіі. Але яе можна зрабіць і ў хатніх умовах. Яна прызначана для гарачага вэнджання мясных і рыбных вырабаў. Складаецца з накрыўкі (1) з гідразатворам (2) — служыць для закрыцця выхаду дыму ў памяшканне: крыжавіны (3) — для падвешвання вырабу; тлушчаразбіральніка (4) — для збору тлушчу; ручкі (6) для пераносу прыстасавання і дна (5).

Засцярога дома ад шашаля-шкодніка

«У бэльках з таполі завяліся нейнія жучкі, якія разбураюць іх. Такая ж бяда ў многіх маіх суседзяў, некаторым нават прыйшлося памяняць бэлькі, перакрыцці. Парайце, як засцерагчы дом ад згубнага нашэсця жучкоў».

(З пісьма).

Будынкі паражоныя вусачом. У трэшчыны і шчыліны драўніны самкі адкладваюць яйкі. Праз два-тры тыдні з іх выводзяцца лічынкі, якія пачынаюць прагрызаць у дрэве хады ўздоўж валокнаў. Пры спрыяльных умовах развіццё лічынкі доўжыцца два гады, пры неспрыяльных — восем — дванаццаць гадоў. Жукі добра лятаюць і хутка трапляюць з аднаго заражанага дома ў суседні.

Рамонт будынка лепш рабіць у сухую пару года. Калі ў драўніне толькі асобныя лётныя адтуліны і яна амаль не разбурана, можна абмежавацца спрынцаваннем заражаных частак. У кожную адтуліну ўводзіцца шпрыцам або маслёнкай вадкі прэпарат, ядавіты для жучкоў. Калі адтулін вельмі многа, трэба ручным пэндзлем моцна прамазаць іх тым жа растворам. Прамазку паўтараюць два-тры разы з перапынкам на два-тры дні. Абмазваць трэба і незаражаныя краі драўніны, прыкладна на 0,5—0,7 метра больш. Можна камбінаваць спрынцаванне з прамазкай. Пасля апрацоўкі ўсе адтуліны павінны быць закрыты якой-небудзь замазкай або пастай. Калі ў апрацаваных месцах з'явяцца новыя лётныя адтуліны, апрацоўку трэба паўтарыць.

У выпадку моцных гнездавых пашкоджанняў, а ўвогуле пры любой ступені пашкоджання лёгказмяняемых асабліва важных элементаў будынкаў (лагі, падлогі, абвязка перагародак і гэтак далей) заражаныя часткі неабходна выпілоўваць і знішчаць, замяняючы іх новымі. Новыя часткі, месцы злучэнняў, а таксама месцы, падвергнутыя пастаяннаму ўвільгатненню, якія часцей за ўсё пашкоджваюцца насякомымі, неабходна антысепціраваць. Дрэва апрацоўваюць антысептыкам з дапамогай пэндзля або апырсквають з гідрапульта. Паколькі драўніна прамочваецца неглыбока, на дватры міліметры, то апрацоўку паўтараюць некалькі разоў.

Найбольш адказныя часткі драўляных канструкцый прамочваюць пастамі, якія засцерагаюць драўніну на многія гады. На паверхню дрэва наносяць тонкі слой паўвадкай пасты, якая складаецца з сумесі парашку антысептыку, клейкага рэчыва і вады. Антысептыкам звычайна бывае фтарысты натрый, а клейкай асновай — спіртавая барта, экстракт сульфітных шчолакаў, адмучаная тлустая гліна і іншыя вязкія пластычныя рэчывы, якія шчыльна прыклейваюцца да драўніны. Можна выкарыстаць і 10-працэнтны раствор пентахлорфеналяту натрыю ў ацэтоне. (На 1м² паверхні расходуецца каля 1 л раствору). Гэты састаў надзейна засцерагае драўніну на працягу пяці гадоў, але ён ядавіты і разбурае фарбавальны слой. Таму яго прымяняюць толькі на асобных дэталях. У продажы бываюць камбінаваныя саставы (напрыклад, дэзінсекталь), 80-працэнтны дынітрафеналят натрыю ў вадзе, 10-працэнтны раствор ліндану або 100-працэнтны раствор тэхнічнага гексахларану ў ацэтоне. Імі абмазваюць заражаныя паверхні, а таксама ўводзяць у адтуліны.

Супраць вусачоў эфектыўныя рэчывы, у саставе якіх пераважае гексілтыафен. Яны ўтвараюцца пры перагонцы бітуміназных сланцаў (фракцыі пры тэмпературы 230—250 градусаў С), лёгка пранікаюць у драўніну хвойных парод, валодаюць моцным кантактным дзеяннем і амаль імгненна знішчаюць насякомых у іх хадах. Гэтыя рэчывы ў той жа час не ядавітыя для чалавека.

(Па матэрыялах часопіса «Наука и жизнь»).

ВОЗГАЛАС

ЯШЧЭ НЕ ВЕЧАР

Як самую безнадзейную для прадпрымальніцтва расцанілі сітуацыю ў нашай рэспубліцы спецыялісты амерыканскага інстытута Крыбла. На працягу трох дзён па ініцыятыве Беларускага народнага фронту яны навучалі беларускіх бізнесменаў прамудрасцям менеджменту, маркетынгу і іншым «замежным штучкам», якімі нам трэба ўсім разам авалодваць.

Доктар Крыбл і яго маладыя калегі лічаць, што галоўнае багацце рэспублікі — добра адукаванае насельніцтва, падрыхтаваныя кадры. Наогул, сведчаць яны, насельніцтва на Усходзе лепш адукаванае, чым на Захадзе, у тым ліку ў ЗША. І такую перавагу трэба ўмець выкарыстаць. Гэта — значны рэсурс рэспублікі.

Існуюць таксама дзелавыя кантакты ў рамках СНД, а гэтыя «рамкі» ахопліваюць значны працэнт насельніцтва зямнога шара. Вось яшчэ адзін «плюс», пра які гаварылі госці.

Няхай не самае лепшае, але ўсё ж ёсць патрэбнае абсталяванне. Выробленая на ім прадукцыя можа быць зусім канкурэнтаздольнай. Асабліва калі прапануўваць яе не на самых складаных рынках збыту — у Амерыцы і Заходняй Еўропе, а пашукаць іншыя (краіны СНД, Азіі і г. д.).

Адным словам, госці былі настроены даволі аптымістычна. Праўда, шчыра паспачувалі сваім беларускім калегам, якія вымушаны плаціць вельмі высокія падаткі. І інтарэсы якіх пакуль што па-сапраўднаму не абаронены існуючым заканадаўствам. Вельмі настойліва раілі мяняць адносіны да справы. Да любой — уласнай, дзяржаўнай. Па прынцыпе: дзе б ні працаваў — працуй, а не гуляй у працу.

А яшчэ раілі згуртоўвацца, каб цалкам законныя патрабаванні прадпрымальнікаў лепш былі пачуты ўрадам.

Паралельна працавала палітычная секцыя.

Варта падкрэсліць адну дэталь: некаторыя выказванні гасцей былі не занадта дыпламатычнымі, іх нават можна расцаніць як умяшанне ва ўнутраныя справы Беларусі. Але, паўшчуваўшы за тое амерыканскіх місіянераў, давайце не будзем усё ж адмаўляцца ад чыста дзелавога вопыту, якім яны з намі дзеляцца. А таму з найбольш карыснымі практычнымі парадамі інстытута Крыбла «Звязда» пазнаёміць пачынаючых прадпрымальнікаў у чарговым выпуску свайго «Бізнес-клуба».

У. БЯРЭЗІН.

«ПЕРАХОДНЫ» ПЕРЫЯД

Пры павальным узлёце цэн рашэнне адміністрацыі гарадской тэлефоннай сеткі ўражвае: з 20 лістапада можна будзе бясплатна пазваніць з любога мінскага тэлефона-аўтамата. Тлумачэнне такога неардынарнага кроку простае — няхватка «пятнашак». Для аматараў доўгіх тэлефонных размоў дададзім, што «пераходны» перыяд хутка скончыцца: трэба толькі абсталяваць гарадскія тэлефонныя буткі новымі апаратамі.

ПЕВЕНЬ У ГАРАДСКОЙ КВАТЭРЫ

Не ведала баба Маня клопату, дык завяла ўлетку некалькіх курачак і пеўня. Апошні стаў прычынай сур'ёзных спрэчак, нават, можна сказаць, канфлікту мясцовага маштабу. Справа ў тым, што жыве баба Маня ў Мінску ў невялічкім старым двухпавярховым будынку, які з усіх бакоў акружаюць пяціпавярховыя гмахі. Дык вось, іх жыхары пагражаюць спаліць маленькі куратнік, які баба Маня зляпіла з рэшткаў драўлянай тары пад акенцам першага паверха, а пеўню — адкруціць галаву. Бо ён, нягоднік, сваім звонкім кукарэканнем пачынае будзіць людзей з чатырох гадзін раніцы.

Баба Маня спачатку не прыдала значэння пагрозам, але аднойчы раззлаваны пралетарый закідаў куратнік каменнямі. І тады старая перавяла пеўня на зімовую кватэру — пасяліла яго ў сваёй кухні.

Леанід ТУГАРЫН.

УЕЗД АБМЕЖАВАНЫ

Новы і яшчэ больш строгі прапускны рэжым уведзены пры наведванні зоны адчужэння, што ўтварылася ў выніку чарнобыльскай аварыі. Дазвол на ўезд у яе цяпер будзе выдаваць толькі прадстаўнік Дзяржкамчарнобыля рэспублікі, які знаходзіцца ў райцэнтры. Выклікана гэта многімі прычынамі. Адной з іх з'яўляецца тое, што ў зону зачасцілі аматары лёгкай нажывы, паляўнічыя, рыбаловы...

Цяпер ахову зоны нясе зводны атрад міліцыі з Брэсцкай вобласці. Цяжкасцей нямала: не вельмі добра наладжана харчаванне, не хапае бензіну для аўтапатрулявання і г. д. Але нягледзячы ні на што на рахунку міліцыянераў ужо нямала затрыманых аматараў пагрэць рукі на чужой бядзе.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА. (БЕЛІНФАРМ).

ДЫК ВОСЬ ТЫ ЯКАЯ, НАША МОЛАДЗЬ

ОРША. Па ініцыятыве аддзела па справах моладзі гарвыканкома ў горадзе на Дняпры было праведзена сацыялагічнае даследаванне сярод вучнёўскай моладзі горада. Было апытана 345 юнакоў і дзяўчат — 120 студэнтаў тэхнікумаў, 75 навучэнцаў ПТВ і 150 школьнікаў. Цікава, што 73 працэнты рэспандэнтаў прызнаюць, што ў Оршы ёсць шматлікія маладзёжныя групоўкі, якія ствараюцца па месцы жыхарства і вядуць паміж сабой бойкі. Аднак толькі 4 працэнты з ліку апытаных (14 чалавек) адказалі, што з'яўляюцца членамі такіх груповак.

Уразілі і адносіны моладзі да беларускай мовы. 72 працэнты апытаных юнакоў і дзяўчат адказалі, што яны не вельмі добра ведаюць гэтую мову, 16 працэнтаў — наогул дрэнна размаўляюць па-беларуску і толькі 12 працэнтаў ведаюць беларускую мову добра. Пры гэтым дзеля справядлівасці трэба дадаць, што большасць (54 працэнты) хацелі б ведаць беларускую мову і толькі 14 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што гэта ім не патрэбна. У час апытання высветліліся цікавыя адносіны аршанскай моладзі і да дзяржаўнасці беларускай мовы. 38 працэнтаў апытаных станоўча ставяцца да гэтага працэсу, 24 працэнты ўспрымаюць дзяржаўнасць беларускай мовы абыякава, 18 працэнтаў рэспандэнтаў адмаўляюць такі варыянт, а кожны пяты на гэты конт не выказаўся зусім. Дададзім яшчэ, што 77 працэнтаў апытаных амаль ніколі не ходзяць на выстаўкі, у музеі і г. д. і толькі 10 працэнтаў ругулярна займаюцца спортам.

БЕЖАНЦЫ

БЕЖАНЦАМ РОЗНІЦА

РАГАЧОЎ. У мясцовым цэнтры занятасці насельніцтва ўжо зарэгістравана 8 чалавек, якія маюць шанц неўзабаве атрымаць статус бежанца, бо прыбылі з неспакойных рэгіёнаў СНД і могуць дакументальна пацвердзіць гэта. Але гэтая лічба — толькі верхняя частка айсберга, бо на Рагачоўшчыну прыбылі ўжо некалькі дзесяткаў чалавек з «гарачых кропак», якія не маюць пашпартоў, прапіскі, іншых дакументаў, якія давалі б ім права прэтэндаваць на статус бежанца. Але імі будуць цікавіцца ўжо не органы працаўладкавання, а органы міліцыі.

Краіна, якая ніколі не будзе для нас «дальнім замежжам»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Два іншыя дакументы — дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій і дэкларацыя аб супрацоўніцтве ў галіне культуры і адукацыі. Іх назвы гавораць самі за сябе.

Напэўна, большага і нельга было чакаць ад аднадзённага візіту. Тым больш, што неўзабаве чакаецца візіт у Мінск прэзідэнта Леха Валенсы па запрашэнню Станіслава Шушкевіча (мяркуючы па ўсім, гэта адбудзецца ў студзені наступнага года).

І Ханна Сухоцка, і Вячаслаў Кебіч устрымаліся ад падрабязных каментарыяў выніку візіту, абмежаваўшыся агульнымі словамі ветлівасці. Зрэшты, мне падалося цікавым, як прэм'ер Польшчы ахарактарызавала галоўныя прынцыпы, на якіх будуе яе краіна свае адносіны з Беларуссю. 'Па яе словах, Польшча зацікаўлена ў незалежнасці і суверэнітэце нашай краіны, якія б у поўнай меры праяўляліся ва ўсіх сферах — і гаспадарчай, і палітычнай, і ваеннай. «Гэта вельмі важны элемент стабільнасці гэтай часткі Еўропы», — зазначыла Ханна Сухоцка. І дадала: «З другога боку, Польшча можа быць вельмі важным элементам на шляху Беларусі да еўрапейскай супольнасці».

Прэм'ер Польшчы ўхілілася ад пытання пра тэмы перагавораў, якія яна вяла сам-насам спачатку з Вячаславам Кебічам, а потым са Станіславам Шушкевічам. «Гэта многія прынцыповыя справы, пра якія мы не можам гаварыць перад прэсай, але якія вельмі важныя для адносін паміж Польшчай і Беларуссю», — рэзюмавала яна.

Зусім магчыма, што за зачыненымі дзвярамі вяліся перагаворы аб супрацоўніцтве ў ваеннай сферы. Тым больш, што перагружаная празмернай колькасцю зброі Беларусь у апошні час актыўна шукае пасрэднікаў і рынкі збыту.

Відаць, абмяркоўвалася і тэма стварэння беларуска-польскага камерцыйнага банка.

Яшчэ адна праблема, без абмеркавання якой, па словах Вячаслава Кебіча, «ніякія перагаворы ў нас з Польшчай не абыходзяцца» — тэма нацыянальных меншасцей. Варшава нязменна надае ёй вельмі важнае месца. Невыпадкова нават за такі кароткі візіт прэм'ер Польшчы знайшла час, каб наведаць Гродна і сустрэцца з актывістамі і кіраўнікамі Саюза палякаў Беларусі. Няма сумнення, што польскі ўрад і далей будзе ўсяляк падтрымліваць сваіх суайчыннікаў на Беларусі, — асабліва ў галіне культуры і адукацыі. Неблагі прыклад для нашых кіраўнікоў у адносінах да польскіх беларусаў.

Дарэчы, адным з афіцыяльных перакладчыкаў Ханны Сухоцкай у час перагавораў у Мінску быў актывіст беларускага руху ў Польшчы, адзін з кіраўнікоў Беларускага дэмакратычнага аб'яднання Алег Латышонак.

...У апошні час з лёгкай рукі маскоўскіх палітыкаў і журналістаў стала папулярным дзяленне замежжа на «дальняе» і «бліжняе». У нас падхапілі гэту тэрміналогію, не дужа зважаючы на тое, што для Беларусі яна дастасуецца менш за ўсё. Калі выходзіць з яе, які-небудзь Таджыкістан для нас — «бліжні», а Чэха-Славакія — «дальняя». Што ж датычыць Польшчы, то да яе тэрмін «дальняе замежжа» ў яе адносінах да Беларусі падыходзіць менш за ўсё. Ва ўсіх сэнсах.

Валянцін ЖДАНКО.
Фота Сяргея ПЛЫТКЕВІЧА.

У КДБ запахла новай фарбай. І новымі сенсацыямі аб карупцыі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

вымовы. Вас гэта, Эдуард Іванавіч, не абражае?

— Згодзен з вамі. Пакуль барацьба з карупцыяй носіць павярхоўны характар. Але што я магу зрабіць са свайго боку, калі няма закона аб карупцыі, які павінны былі прыняць яшчэ год назад. Калі прыходзіцца змагацца не з нейкімі там рэцыдывістамі, а з цэлай сістэмай злачынных дзеянняў асоб на самых высокіх пасадах?

Адразу пасля выхаду 588-й пастановы Саўміна аб карупцыі трэба было стварыць камісіі з удзелам праваахоўных органаў, дэпутатаў, спецыялістаў у розных галінах, прадстаўнікоў грамадскасці. І вызначыць канкрэтныя тэрміны разбору з тым ці іншым выпадкам злоўжывання службовым становішчам.

— А камісіі па якіх напрамках вы прапанавалі б стварыць?

— Па-першае, па вывазе стратэгічнай сыравіны за межы рэспублікі прадстаўнікамі ўлады, некаторымі міністэрствамі і рознымі кааператыўнымі арганізацыямі. Па-другое, па здзелках з замежнымі дзяржавамі. Вельмі часта асобныя службісты заключаюць такія здзелкі на шкоду інтарэсам рэспублікі.

— Эдуард Іванавіч, КДБ не быў бы КДБ, калі «выкладваў» усю інфармацыю. Колькі яе не ўвайшло ў ваш даклад на сесіі?

— Матэрыялаў шмат. Цяпер намі вядзецца каля двухсот аператыўных спраў па матэрыялах, што звязаныя з карупцыяй на тэрыторыі рэспублікі. Калі яны будуць закончаны, я пакуль дакладна сказаць не магу.

— Міністр унутраных спраў Уладзімір Ягораў у інтэрв'ю нашай газеце сказаў, што надышоў час уступаць у бліжні бой з карупцыяй. Калі ён пачнецца, на вашу думку?

— Я думаю, што да канца гэтай сесіі. Альбо мы ўбачым канкрэтныя меры рэагавання на нашу інфармацыю, альбо выдадзім усё, што мы ведаем. А гэта, паверце, нямала.

— Вы верыце ў першае?

— Мне пазваніў нядаўна адзін разумны чалавек і сказаў: «Ты прайграеш, таму што ўступіў у бой з даларам, а долар перамагчы немагчыма».

Я думаю, нашы магчымасці да канца яшчэ не вычарпаныя. Мы, са свайго боку, будзем пастаянна трымаць Вас у курсе гэтага бою.

Гутарыў Аляксандр КОКТЫШ.

«Не трэба гаварыць, што ў нас гіне мастацтва»

СЕННЯ У МІНСКУ АДКРЫВАЕЦЦА XIX МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МАСТАЦТВАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ВОСЕНЬ».

Напярэдадні гэтай важнай у культурным жыцці рэспублікі падзеі карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з дырэктарам Беларускай філармоніі Уладзімірам РАТАБЫЛЬСКІМ і папрасіла расказаць пра асаблівасці сёлетняга фестывалю.

— Гэта будзе, бадай, самы моцны фестываль (з усіх 19-ці) па прадстаўніцтву музычных «зорак» еўрапейскага ўзроўню. Мяркуйце самі: у праграме фестывалю выступяць славуты піяніст Святаслаў Рыхтэр, віяланчалістка Наталля Гутман, саліст Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі Зураб Сяткілава, музыканты з Эстоніі Ханэс Алтраў і Пеэп Ласман, ансамбль старадаўняй музыкі з Англіі «Лес Рэчытанс», арганіст са Швецыі Сціг Густаў Шонберг, піяніст з Італіі Джузэпе Марыёці. А цудоўныя сустрэчы з Маскоўскім дзяржаўным акадэмічным камерным хорам пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мініна, камерным аркестрам «Санкт-Пецярбург-Камерата» пад кіраўніцтвам Саўлюса Сандзецкіса. У фестывалі таксама прымуць удзел музыканты з Кіева, Шаўляя, Смаленска, Запарожжа, Іванава, Самары, іншых гарадоў «бліжняга замежжа». Ну і, вядома, усе лепшыя беларускія выканаўцы. Каля 70 творчых фарміраванняў выступяць у насычанай і разнастайнай праграме «Беларускай музычнай восені». Канцэрты пройдуць амаль ва ўсіх вёснах рэспублікі — іх будзе больш за трыста.

Мы застаёмся вернымі традыцыі: на фестывалі павінна гучаць лепшая музыка. Напярэдадні сустрэчы з творамі Баха, Моцарта, Гайдна, Бетховена, Чайкоўскага, Сен-Санса, Шастаковіча. Дадам, што ў рамках фестывалю пройдзе І Міжнародны конкурс віяланчалістаў, на заключным канцэрце 30 лістапада выступяць лаўрэаты.

— Сапраўды, у рэспубліцы пачынаецца Свята музыкі.

— І гэта дзякуючы падтрымцы і разуменню важнасці фестывальнай справы з боку нашай дзяржавы. Дзяржава паранейшаму застаецца нашым асноўным фундатарам. Таму мы можам — нягледзячы на традыцыйныя фінансавыя цяжкасці — запрасіць на фестываль артыстаў першай велічыні. Мы не маем права пазбаўляць беларускую публіку сустрэч з цудоўнай высокай музыкай. Прычым артысты з радасцю адклікаюцца на запрашэнне, літаральна выкройваюць гадзіны, каб трапіць у Беларусь. Напрыклад, у творчым раскладзе выдаткай віяланчалісткі Наталлі Гутман не было ніводнага «акенца», і ўсё ж 25 лістапада яна прыедзе ў Мінск: з поезда — адразу на канцэрт, і потым зноў у дарогу. А наконт ганарару яна і гаварыць адмовілася — канцэрт будзе дабрачынным, сабраныя сродкі пойдуць у адзін з чарнобыльскіх фондаў.

—Ці будзе гучаць на фестывалі беларуская музыка?

— Фестываль адкрыецца сімфоніяй кампазітара В. Кандрусевіча «Плач перапёлкі». Подступам да яе было стварэнне музыкі да аднайменнага тэлесерыяла рэжысёра Ігара Дабралюбава па трылогіі Івана Чыгрынава. Сёння ўвечары адбудзецца прэзентацыя гэтага грунтоўнага твора.

— У размове пра высокае не хацелася б апускацца на нашу грэшную зямлю, і ўсё ж... Якім будзе кошт білетаў? Ці зможа трапіць на «зоркавы канцэрт» чалавек, скажам, сярэдняга дастатку?

— Мы доўга абмяркоўвалі, колькі павінен каштаваць білет. Безумоўна, на лепшыя канцэрты кошт білета можна было б зрабіць у многа разоў большым. Аднак вырашылі, што гэтага рабіць ні ў якім выпадку нельга. Фестывальныя білеты каштуюць 70—100 рублёў. Вялікае мастацтва не павінна быць прадметам спекуляцыі. Яно духоўна ўзбагачае чалавека, вучыць прыгожаму, выхоўвае культуру пачуццяў.

Гутарыла Таццяна ПАДАЛЯК.

ФОТА-АБВІНАВАЧВАННЕ

Гэтае кукурузнае поле так і засталося няўбраным. Ці то не хапіла часу механізатарам калгаса «Камуніст» Жлобінскага раёна, ці то вдбіліся перабоі з гаручым. А хутчэй за ўсё — гэта вынік безгаспадарчасці, у той час як праблема кармоў для жывёлы стаіць вельмі востра.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА. (БЕЛІНФАРМ)

РАЗЛІКОВЫ БІЛЕТ СУПРАЦЬ РУБЛЯ: ПАЧЫНАЮЦЦА БАІ МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар).

адпаведную «ўзнагароду» прапануюць паслугі абмену «іншаземцам». І гэта прытым, што пры кожным факце абмену даныя пашпарта заносяцца ў спецыяльны спіс. Выбарачная праверка абменных пунктаў сталіцы Беларусі паказала, што некаторыя асобы мянялі грошы па 5—10 разоў, атрымліваючы за гэта ад «кліентаў» добры навар.

Яшчэ адна небяспечная тэндэнцыя асабліва выразна пачала праяўляцца ў апошнія дні, хаця яна прама і не звязана з процірублёвымі мерамі. Літаральна па пальцах зараз можна пералічыць банкі Беларусі, якія эжыццяўляюць продаж валюты, ды і аб'ём яе куплі ў насельніцтва значна скараціўся. І банкі і людзі чакаюць рэзкага скачка курса долара (і, адпаведна, іншых валют) у адносінах да рубля і разліковага білета. Такія надзеі падсілкоўваюцца звесткамі з Украіны, дзе пасля аб'яўлення мата «драўляным» кошт долара перасягнуў 630-рублёвую адзнаку. Аднак няпэўнасць становішча на Беларусі ў цэлым пакуль не дазваляе рабіць пэўных прагнозаў у гэтай галіне.

Таму рэкамендуем сваім чытачам ўважліва сачыць за рашэннямі мясцовых улад, якія сёння-заўтра без аглядкі на Дом урада скажуць сваё важкае слова, якое прывядзе да накдаўна (а можа, і накаўта) рубля ў адной асобна ўзятай вобласці.

Кар. «Звязды».

Першы крок беларускіх ваўчэраў?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

та азначае? Калі грамадзянін атрымаў чэк на жыллё, то ён абавязаны ўкласці гэты чэк у прыватызацыю сваёй кватэры (калі кватэра дзяржаўная). Праўда, калі якая-небудзь рэшта застаецца, дык яе можна «трансфармаваць» у маёмасць або зямлю.

Камісія па эканамічнай рэформе, абапіраючыся на сумны прыклад абясцэньвання расійскіх чэкаў, прадугледзела абарону беларускіх: 50 працэнтаў ад кошту прыватызуемых аб'ектаў у абавязковым парадку трэба будзе выплачваць толькі прыватызацыйнымі чэкамі. Значыць, грамадзянам Беларусі даецца магчымасць удзельнічаць у рынку каштоўных папер. Вытворчыя калектывы, якія пастараюцца ўтварыць закрытыя акцыянерныя таварыствы або закрытыя калектыўныя прадпрыемствы, вымушаны будуць шукаць інвестараў на баку, купляць чэкі і, натуральна, прапаноўваць долю сваёй маёмасці або акцыі.

Нарэшце самае галоўнае — колькасць чэкаў, якія зможа атрымаць кожны. Яна будзе залежаць ад узросту і працоўнага ўкладу ў стварэнне агульнадзяржаўнай уласнасці. Мяркуецца, што тыя, каму за 35 гадоў, атрымаюць 50 чэкаў, ва ўзросце ад 30 да 35—40, ад 25 да 30 — 30, і ва ўзросце ад 16 да 25—20 чэкаў. На дзяцей, якім не споўнілася 16 гадоў, 10 чэкаў атрымаюць бацькі. Не пакрыўдзяць і людзей старэйшага ўзросту: за кожны год працоўнага стажу ім будзе дадавацца яшчэ адзін чэк.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

МАЙСТЭРНЯ ГАСПАДЫНІ

І рамонт, і ўпрыгажэнне

Дзеці часта рвуць адзенне на каленях і локцях. Дзірку можна закрыць аплікацыяй з тканіны. А некаторыя маці робяць аплікацыі і на новай вопратцы, каб засцерагчы ад дзірак.

Калі адзенне парвалася на нязручным месцы, вырваны кавалак на баку ці спіне, можна закрыць яго парасончыкам і яшчэ тры-чатыры такія ж парасончыкі раскідаць у некалькіх месцах у выглядзе вышыўкі.

Работа гэта простая, але патрабуе фантазіі і зацікаўленасці.

***

Любую аднатонную сукенку ці блузку ўпрыгожыць вышыўка-манаграма, размешчаная, напрыклад, на кішэні. На малюнку некалькі магчымых варыянтаў спалучэння літар. Складзіце малюнак з першых літар свайго імя і прозвішча і бярыцеся за работу. Вышыўка можа быць выканана ніткамі ў тон тканіны ці кантраснымі, галоўнае — спачатку праверце, ці не ліняюць ніткі.

Манаграмы можна вышыць на абрусе, сурвэтках, пасцельнай бялізне, насоўках і г. д.

Свае колы

КАЛІ НЯМА ТАКАРНАГА СТАНКА

Калі на рабочых паверхнях барабанаў можна ўбачыць рыскі і драпіны — гэта азначае, што прыйшла пара змяніць калодкі ў колавых тармазах. Гэтыя няроўнасці намнога падаўжаюць тэрмін прыпрацоўкі новых накладак, пагаршаюць эфектыўнасць тармазоў. Таму і прапануюць аднаўляць чыстату барабанаў на такарным станку.

Але ці можна абысціся без яго? Можна. Вывесіце машыну, падстрахуйце падстаўкай і здыміце задняе кола. Затым сцягніце барабан з паўвосі, перавярніце яго і зноў замацуйце на пасадачным месцы так, каб рабочая паверхня аказалася знадворку. Запусціце рухавік, уключыце першую перадачу — вывешаная паўвось з барабанам пачне круціцца. Цяпер трэба падвесці да рабочай паверхні востры шабер ці наждачны камень — і вы хутка і даволі чыста ліквідуеце ўсе дэфекты.

ЗГУБЛЕНЫ КАЎПАЧОК

Калі згубіўся каўпачок, што засцерагае ад бруду штуцэр тармазнога цыліндра, — не бяда. Ад шланга для перапампоўвання адрэжце маленькі кавалачак, надзеньце яго на штуцэр, а тарэц гэтай насадкі заляпіце пластылінам ці невысыхаючай сінтэтычнай замазкай для вокнаў, якую наогул добра мець у бартавой гаспадарцы.

НАКРЫЎКА З ФЛАКОНА

На расшыральным бачку сістэмы ахалоджвання замест згубленай накрыўкі

можна прыклеіць частку горлачка з коркам ад пластмасавага флакона з-пад шампуня, як паказана на малюнку. Клей «88» ці «Момант» забяспечвае трывалае злучэнне.

У корку трэба зрабіць адтуліну, а пад яе падкласці гумавую шайбу з прораззю так, каб атрымаўся клапан, як у заводскай накрыўцы.

РАМАНТУЕМ ТРОС

Уладальнікі «Запарожцаў» аднойчы сутыкаюцца з характэрнай для гэтай машыны непрыемнасцю — абрывам троса дросельнай заслонкі карбюратара. Трос пераціраецца разам з педаллю газу, дзе ён уваходзіць у трубку.



Трэба вызваліць канец троса, замацаваны на рухавіку, і крыху выцягнуць трос у салон. Затым пры дапамозе дзвюх шайбаў і балта М5 замацоўваем абарваныя канцы, як паказана на малюнку. Цяпер трос будзе ўваходзіць у трубку, амаль не датыкаючыся да краю, што паспрыяе яго даўгавечнасці.

ГУЧНЫ СІГНАЛ

У «Жыгулях», якія вельмі доўга эксплуатуюцца, пачынае дрэнна працаваць гукавы сігнал. Калі зняць руля-



вое кола, то будзе бачна, што латуннае кантактнае колца на калодцы месцамі сцерлася. Для аднаўлення кантакту трэба выразаць колца з латуннага ліста (глядзіце малюнак) таўшчынёй 0,7 мм, накласці яго на старое, загнуць вусікі і прыпаяць па краях.

«КРАКАДЗІЛ» І ШЫЛА

Каб выявіць непрацуючы цыліндр рухавіка, звычайна



рэкамендуецца па чарзе здымаць правады са свечак. Гэта пагражае непрыемным ударам току.

Але самому можна зрабіць простае прыстасаванне. Яно вырабляецца з шыла і зацiскачкі тыпу «кракадзіл», якія злучаюцца паміж сабой провадам. Для выключэння цыліндра зацiскачка замацоўваецца на непафарбаванай дэталі, а шыла ўводзіцца між высакавольтным провадам і гумавым каўпачком па накрыўцы размеркавальніка. Атрымліваецца эручна і хутка.

РЫБАЦКІЯ ЗГАДКІ

Зімой на шчупака

Тым, хто ідзе на шчупака, шанцуе і зімой. Гульня іх блешняў не вызначаецца асаблівай складанасцю. Яна часцей за ўсё тая ж, што і пры лоўлі акуня. Але лепш за ўсё шчупак бярэ на «карасіка» (мал. 1).

Гэтая прынада мае даволі складаную канфігурацыю. Тут не абысціся без спецыяльнай формы, для якой патрэбны асаблівыя сумесі. Падрыхтаваную абалонку змяшчаюць у форму, устанаўліваюць пры дапамозе фіксатара кручок і заліваюць свінец. Потым паверхню апрацоўваюць.

Канструкцыі ж іншых зімовых блешняў патрабуюць самую простую матрыцу і



прымітыўныя правілкі, як, напрыклад, для вырабу дзвюх такіх блешняў (мал. 2).

Па першым лёдзе шчупак добра ловіцца ля трысняговых зараснікаў, у вокнах сярод раслін. Нярэдка ўслед за дробяззю ён выходзіць на параўнаўча мелкія месцы. Таму перш чым біць лункі, трэба абследаваць вадаём і намеціць месцы лоўлі.

У глухазім'е палассты драпежнік ажыўляецца ў перыяд працяглых адліг.

Хватка ў шчупака бывае настолькі моцная, што можа



выбіць вудзільна з рук ці паламаць яго, калі вяршыня недастаткова гнуткая і трывалая, каб амартызаваць сілу рыўка.

Асабліва вабяць драпежнікаў цяжкія вузкія блешні (як на мал. 2), зробленыя з дзвюх пласцінак: сярэбранай і з нержавеючай сталі (ці бронзавай, латуннай), злучаных прыпоем і старанна адшліфаваных. Даўжыня прынады 40—80 см. Планіруючая блешня павінна злёгку перавальвацца з боку на бок.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

23 лістапада, ПАНЯДЗЕЛАК

Беларускае тэлебачанне

16.30. Гісторыя Беларусі, 5 клас.
16.55. Экран дзіцячага фільма. «Кешка і гангстэры», «Кешка і спецназ».
17.40. «Плюх і Пліх», «Чаму вярблюд есць калючку». Мультфільмы.
18.00 Каралеўскае паляванне. Шоу-казіно.
19.00 Абласныя навіны (Брэст).
19.10. «Вяртанне». Падуя — старонка з жыцця Ф. Скарыны.
19.55. Гаспадар. Сённяшні дзень вяскоўцаў Лагойскага раёна.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Еўразія» прадстаўляе... Маст. фільм «Гадзіна забойстваў» (ЗША).
23.15. Спартыўны тэлекур'ер.
23.35. НІКа.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. Паглядзі, паслухай.
8.40. «Вучань чараўніка». Мультфільм.
9.00. «Бязмежны Разанаў».
10.10. Брэйн-рынг.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. Знаёмцеся: «Разумнікі і разумніцы». Пра новую перадачу для старшакласнікаў.
16.30. НЭП.
17.00. Навіны.
17.25. Тэхнадром.
17.35. Зоркі час.
18.15. Футбольны агляд.
18.45. Сустрэча для вас.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Дробязі жыцця», 8-я серыя «Кароткае замыканне».
21.10. «Новая студыя» прадстаўляе. Бамонд.
21.25. Аднак.
21.40. Жыццяпіс.
22.00. Сітуацыя.
22.40. Яўгеній.
22.50. Мы.
23.00. Навіны.
23.20. Джэм-сейшн.

Канал «Расія»

17.15. Настальгічныя вячоркі.
17.45. «Іграем Чэхава». Фестываль расійскіх тэатраў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Цень папараці». Маст. фільм.
20.55. Экран крымінальных паведамленняў.
21.05. На пытанні А. Каравулава адказвае міністр эканомікі Расіі А. І. Нячаеў.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. Палігон.
23.15. У канцэртнай зале. «Памяццю серца».

24 лістапада, АЎТОРАК

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Па-дэ-дэ з балета Л. Мінкуса «Баядэрка».
9.00. Гісторыя Беларусі. 5 клас.
9.25. «Іван і Аляксандра». Маст. фільм.
10.45. «Вайгач». Дак. фільм.
11.00. «Еўразія» прадстаўляе... Маст. фільм «Гадзіна забойстваў» (ЗША).
16.30. Гісторыя Беларусі. 8 клас.
17.05. Для старшакласнікаў «Ці любіце вы тэатр?»
18.00. «Лучніца». Дак. фільм.
18.10. Беларуская музычная восень. Знаёмцеся — Дзяржаўны ансамбль танца «Марый Эл».
18.50. Абласныя навіны (Віцебск).
19.00. Эканамічная хваля. Якому банку даверыцца? Прымаюць удзел прадстаўнікі дзяржаўных і камерцыйных банкаў Беларусі.
20.00. Акцыя «Дзеячы культуры супраць СНІДу».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. «Рыцары неба». Маст. фільм (Францыя). 3-я серыя.
22.10. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа. Відэасалон. «Кондар». Маст. фільм (Венгрыя).

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. Паглядзі, паслухай.
8.40. «Вучань чараўніка». Мультфільм.
9.00. Бізнес-клуб.
10.10. Брэйн-рынг.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Маст. фільм «Давыд і Галіяф» (Балгарыя).
12.30. «Хроніка бутэрброднай вайны». Мультфільм (ЗША).
12.55. «Разам». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Дзелавы веснік.
14.40. Свет грошай Адама Сміта.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. Стартынейджэр.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. «Сунічны дожджык». Мультфільм.
17.35. «Два дні ў Малдове». Сустрэча з М. Снегурам.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. Мініяцюра.
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Рэпартаж ні аб чым.
20.55. Фільмы А. Міндадзе і В. Абдрашытава. «Парад планет».
22.30. Ваенная рэвю.
23.00. Навіны.
23.25. А. Скрабін. Другая сімфонія: Дырыжор — Я. Святланаў.
0.15. Валейбол. Жанчыны. «Іскра» (Луганск) — «Арбіта» (Запарожжа).

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
11.00. «Адзінокі голас чалавека». Маст. фільм.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. «Вадабокі». Праграма для дашкольнікаў (Францыя).
15.50. Мульці-пульці.
16.00. Там-там навіны.
16.15. Урал—ТВ.
17.00. Танга над востравам.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Айчына мая. «Аз есмь».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. І. Стржэльчык у «Старамодным камедыі» А. Арбузава.
21.00. Вяртанне.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. Спявае хор Н.Корнева.
23.15. Арт-абстрал.

25 лістапада, СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «У гарах Урала».
9.00. Гісторыя Беларусі. 9 клас.
9.35. «Марыя і мора». Маст. фільм.
11.05. «Анатоль Салаўяненка на сцэне і па-за сцэнай...» Фільм-канцэрт.
16.30. Л. Карнавухава, Л. Бравусевіч. «Пунсовая кветачка». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
17.40. «Следства вядуць Калабкі». Мультфільм.
18.00. Дак. фільм «Маці чалавечая».
18.30. Геракл. Телеклуб аматараў культурызму.
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.10. Сустрэчы ў клубе дырэктараў, ці Позірк збоку.
19.40. Роднае слова.
20.20. Сцежка да чыстай крыніцы. Тэленарыс пра настаўніка малявання школы № 201 г. Мінска А. А. Стральченю.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». Маст. фільм (Францыя): 4-я серыя.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — Рэйцінг. НІКа. «Майстэрня». Мастак Аляксей Марачкін.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.50. Мультфільмы «Дзве казкі», «Уся справа ў капелюшы».
10.20. Рок-урок.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Маст. фільм «Камічны палюбоўнік, ці Любоўныя забавы сэра Джона Фальстафа».
12.35. «Шчаслівы берег». Маст. фільм (Польшча).
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. Рок-урок.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. «У тасцях у гномаў». Мультфільм.
17.35. Міждзяржаўны тэлеканал «Астанкіна» прадстаўляе.
18.10. «Багатыя таксама плачуць».
18.55. Футбол. Кубак УЕФА. «Дынамо» (Масква) — «Бенфіка» (Партугалія). 1-ы тайм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Футбол. Кубак УЕФА. 1/8 фіналу. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. «Бруге» (Бельгія) —ЦСКА. Пасля заканчэння (23.20) — Навіны.
23.40. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў.
0.30. «Камічны палюбоўнік, ці Любоўныя забавы сэра Джона Фальстафа». Маст. фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Вольны час. «Сябры нашы кошкі».
12.05. «Бурда модэн» прапануе...
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Сігнал.
15.15. «Сям'я Смірновых. Як жыць далей?» Тэлефільм (Аўстрыя).
16.00. Там-там навіны.
16.15. Далёкі Усход.
17.00. Хрысціянская праграма.
17.45. «На Вы...» Дыскусійны клуб. Дэмакратычны выбар — «Грамадзянскі саюз».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. Сам сабе рэжысёр.
20.50. Крымінальныя паведамленні.
21.00. «Монстр». (Расія—ЗША). Фільм 5-ы «Сталін і вайна».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.

ЗАПРАГРАМУЙЦЕ СВАЁ ЗАЎТРА Dainova

22.45. «Я іншай такой краіны не ведаю» (ПАР).
23.10. Студыя «Сатырыкон».

26 лістапада, ЧАЦВЕР

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Балет Ігара Майсеева.
9.50. «Свой крыж». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
16.25. Праграма перадач.
16.30. Музыка і спевы. 2 клас.
16.50. «Дзень добры таму, хто ў гэтым даму». Жодзінская школа-гімназія.
17.30. «Марусіна карусель», «Ліса, мядзведзь і мужык», «Дзіводная бочка». Мультфільмы.
18.00. Адкрыты Кубак Беларусі па цяжкай атлетыцы. Трансляцыя з Віцебска.
18.30. Спявае вакальны дуэт Л. Каспорская і Л. Івашкоў.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Як пачаць уласную справу. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. Яшчэ раз аб прыватызацыі. Рэпартаж з Міжнароднай канферэнцыі.
20.15. Тыдзень беларускага ўрада.
20.35. Справа выпадку. Лятарэя ўдачы.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». Маст. фільм (Францыя). 5-я серыя.
22.00 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа. Другі канцэрт К. Сен-Санса для фартэпіяна з аркестрам. Саліст А. Сікорскі.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.30. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Маст. фільм «Перад экзаменам».
12.25. «Да каго заляцеў пеўчы кенар». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэлемікст.
15.10. Блакнот.
15.15. «Пчала Мая».
16.05. «Калыска чатырох чараўніц» (Мінск).
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. «Дзіўны звер». Мультфільм.
18.20. «Багатыя таксама плачуць». Заключная серыя.
18.45. Музыка ў эфіры. Частка 1-я.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато-мільён.
21.10. Маст. фільм «Пайсці і не вярнуцца».
22.25. Чорная скрыня.
23.00. Навіны.
23.25. Музыка ў эфіры. Частка 2-я.
0.25. «Да каго заляцеў пеўчы кенар». Тэлефільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. «Монстр». Фільм 5-ы «Сталін і вайна».
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Вольны час.
12.05. Палігон.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Вучыцца рынку.
15.30. «Студыя «Рост». «Музычны клас».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Да Масквы далёка.
17.00. Так і жывём.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. «На Вы...» Дыскусійны клуб. Дэмакратычны выбар — «Грамадзянскі саюз».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.45. Спецыяльны камерцыйны веснік.
21.00. Айчына мая. «Пецярбургскія куткі».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. Партрэт кампазітара Г. Баншчыкаў.
23.15. Джаз-філармонік-хол (Швецыя).

27 лістапада, ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Чарнахвостая чайка». Кінапарыс.
9.00. Музыка і спевы. 2 клас.
9.20. Кінанастальгія. «Сярод добрых людзей».
10.40. «Дзень цыркавога артыста». Тэлефільм.
11.45. «Анюціны вочкі і панскія ласкі». Маст. фільм.
16.30. «Вініі-Пух», «Вініі-Пух ідзе ў госці», «Вініі-Пух і дзень турбот», «Гарлачык». Мультфільмы.
17.20. Голас. Літаратурна-мастацкі відэаканал для школьнікаў.
18.00. Беларуская музычная восень. Іграе Наталля Шахаўская (віяланчэль).
18.35. «Тры тысячы песень». Дак. фільм.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Творчае аб'яднанне МЭТА. Свята ў Мірскім замку.
20.10. Хакей. «Дынамо» (Мінск) — ЦСКА (Масква).
20.50. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.40. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа. Кінанастальгія «Сярод добрых людзей». Адкрыты Кубак Беларусі па цяжкай атлетыцы.

Канал «Астанкіна»

5.00. Навіны.
5.20. Раніцняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.30. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Маст. фільм «Леў Гурыч Сінічкін».
12.35. «Наша дача». Маст. фільм.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Брыдж.
14.50. Бізнес-клас.
15.10. «Пчала Мая».
16.00. Дак. фільм «Шуманскія крыніцы».
16.10. Цэнтр.
16.50. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.20. «Нарманды — Нёман». Паўстагоддзя памяці і дружбы.
17.50. Чалавек і закон.
18.20. Вагон 03.
18.50. Поле цудаў.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Стары сябар» з тэлесерыяла «Лінда» (Венгрыя).
21.35. «ВІД» прадстаўляе: «Палітбюро».
22.05. Музагляд.
22.45. Чалавек тыдня.
23.00. Навіны.
23.20. Аўташоў.
23.40. Хіт-канвеер.
0.40. «Наша дача». Маст. фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
11.00. Санта-Барбара.
11.50. Вольны час. «ТВ-ательле».
12.05. Настальгічныя вячоркі.
12.35. Т. Ін. Ка.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Тэлебіржа.
15.30. Студыя «Рост». «Кенгуру».
16.00. Там-там навіны.
16.15. Мінарэт.
16.30. «Сям'я Смірновых. Як жыць далей?» Тэлефільм (Аўстрыя).
17.15. М-трэст.
17.30. «Справа Джасціна». Маст. фільм.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Экспацэнтр прадстаўляе.
19.25. Тэма з варыяцыямі. «Руская песня» збірае сяброў.
21.00. «Монстр». (Расія—ЗША). Фільм 6-ы «Апошняя імперыя».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Сёння ў ВС Расіі.
22.45. Вячэрні салон.

28 лістапада, СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Музыка працягваецца». Фільм-канцэрт.
9.10. Кім становіцца чэмпіёнам. Спартыўна-публіцыстычная праграма.
10.00. Гарадніца. Літаратурна-мастацкая праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Чалавек. Аўтамабіль. Дарога.
11.50. «Палеская марка». Сённяшні дзень Пінскай запаланай фабрыкі.
12.20. Вярніце нам дзяцінства. Перадача 1-я. «Дзеці — вязні вайны».
13.10. Алімпійскі сілуэт. Інтэрв'ю прэзідэнта НАК Беларусі У. М. Рыжанкова.
13.30. «Дзеці ў бядзе». Беларускі дзіцячы гематалагічны цэнтр.
15.35. «Аб'ектыў-тэатр». Новыя гарызонты купалаўцаў. Частка 1-я.
16.05. ПІК.
17.10. «Аб'ектыў-тэатр». Новыя гарызонты купалаўцаў. Частка 2-я.
18.00. Песню бярыце з сабою. Частка 1-я.
19.00. «Падарожжа па Амерыцы». Перадача 4-я. Штат Нью-Мексіка, горад Санта-Фе.
19.25. «Міс-Еўропа». Шоў-праграма.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Тэлебіржа.
21.45. «Сінема» прадстаўляе: «Усіх за краты!» Маст. фільм. (Італія). 1-я серыя.
22.40. «У стылі рэтра». Музычная праграма.
23.10. Адкрыты Кубак Беларусі па цяжкай атлетыцы.
23.45. НІКа.
20.00. «Відзьма-нявідзьма». Навіны відэа-кіна-аўдыё.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Раніцняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. У свеце матораў.
8.00. «Марафон-15» — малышам. Мультфільм «Мой маленькі поні» (Вялікабрытанія). 1-я серыя.
8.25. Эльдарада.
8.55. Аўтограф па суботах.
9.25. Справа.
9.35. Інстытут чалавека.
10.05. Авіякасмічны салон.
10.20. Стыль.
10.50. Невядомая Азія. Ці прыйдзе князь Усходу?
11.20. Музычны кіёск.
11.50. Музычны відэафільм «Евангелле для хітрага». Пастаноўка У. Васільева.
13.00. Студыя «Палітыка» прадстаўляе праграму ЗША «Свабода выбару» з удзелам эканаміста М. Фрыдмана. Перадача 2-я. «Тыранія кантролю».
13.30. «Тэлемемуары». Музычная праграма.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Тэхнадром.
14.35. «Фарбы вясёлкі». Заключная перадача фестывалю тэлепраграм народнай творчасці «Вясёлка».
15.35. Адкрыццё Еўрапейскага цэнтра рускай культуры.
15.45. Чырвоны квадрат.
16.25. Мультфільм «Дракуліта-вампіраня» (Францыя).
16.50. Вагон 03.
17.20. Мультпамфлет па аднайменнаму апавяданню Д. Хармса «Аб з'явах і існаванні».
17.25. «Страсці па Марыяне». Дак. фільм.
18.15. Маст. фільм «Да першай крыві».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Брэйн-рынг.
21.35. Максіма.
22.00. Еўропа плюс.
23.00. Навіны.
23.20. Маст. фільм «Сэкс-місія» (Польшча).

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Мастацтва адлюстравання. «Месячны шлях Набукаі Мураока».
7.50. Эскудап. «Пра інтымнае для ўсіх».
8.00. «Размовы папросту». Перадача 2-я.
8.30. Калі вам за...
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. Бумеранг.
11.00. «Вучань лекара». Маст. фільм.
12.25. Невядомыя інтэрв'ю. Ясір Арафат.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. XX стагоддзе ў кадры і за кадрам. Васіль Шукшын.
14.20. Пілігрым.
15.05. Казырная дама.
15.35. «К-2» прадстаўляе: «Зоркі Амерыкі».
16.05. Футбол без межаў.
17.00. «К-2» прадстаўляе. «Абзац».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Маскі-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Час забойстваў». Маст. фільм (ЗША).
21.10. Кантрасты.
21.45. Рэпарцёр.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
0.00. «Завяшчанне прафесара Доўэля». Маст. фільм.

29 лістапада, НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Двое на голай зямлі». Маст. фільм.
10.00. Як зберагчы зрок дзіцяці. Перадача 4-я.
10.15. «Арбіта». «У нядзелю раніцай». Прадстаўляе Адэская студыя тэлебачання.
11.15. Урокі здароўя. «Вы прыйшлі ў басейн...»
11.45. Мы такія розныя. Музычна-забаўляльная праграма з удзелам мастацкіх калектываў Дома творчасці для дзяцей і юнацтва г. Бабруйска.
12.45. «Сівой даўніны покліч. Помнікі расказваюць». Бланітныя купалы Самарканда».
13.05. Вярніце нам дзяцінства. Перадача 2-я. Прымаюць удзел кіраўнікі міністэрстваў костыцы і сацзабеспячэння, Мінгарыканкома, Савета Міністраў.
13.35. Чэмпіянат рэспублікі па спартыўных танцах. Перадача 2-я.
14.50. «Прагулка ката Леапольда». Мультфільм.
15.00. Паміж намі, жанчынамі. Джанет Кёстр—наша сучасніца.
15.50. Існасць. Духоўна-рэлігійная праграма.
16.40. «Успомнім...» Вечар памяці акцёраў.
18.00. Песню бярыце з сабою. Частка 2-я.
19.00. Адкрыты Кубак Беларусі па цяжкай атлетыцы. Трансляцыя з Віцебска.
19.25. З панядзелка... Хочаш жыць? Умей.
20.00. Панарама.
20.30. «Каскад».
20.40. Калыханка.
21.00. Чэмпіянат Еўропы па валейболу. Беларусь—Эстонія.
21.40. Студыя «Сэнс» у Глускім раёне.
23.05. «Сінема» прадстаўляе: «Усіх за краты!» Маст. фільм. (Італія). 2-я серыя.
20.00. Студыя «Тэлесябрына». Пепсі-топ-20».
0.40. «Каралеўскае паляванне». Шоў-казіно.

Канал «Астанкіна»

6.00. Час сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлато».
7.15. «Залатая антылопа». Мультфільм.
7.45. «Людзі і богі Тыбета».
8.15. Рапым-рана. Мультфільм. «Дэнвер—апошні з дыназаўраў» (Францыя).
8.45. Сола.
9.15. «Пакуль усе дома». Забаўляльная праграма.
9.45. Прэм'ера рубрыкі «Разумнікі і разумніцы».
10.25. Пад знакам «Пі».
11.15. Маст. фільм «Прыгоды Чорнага Прыгажуна».
11.40. Новае пакаленне выбірае.
12.30. Мультфільм «Піф і Геркулес».
12.40. Дак. фільм «Падводная адысея каманды Кусто».
13.30. «Дом на Валхонцы». Фільм 7-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Жывое дрэва рамёстваў.
16.00. Панарама.
16.40. Тэлелоцыя.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Акцёры, акцёры, акцёры...
19.00. Нядзельная кінапраграма. Кінаафіша.
19.25. Маст. фільм «Карнавальная гісторыя» (ЗША).
21.00. Выніхі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. «Сёння». Рэлігійная праграма.
23.00. Навіны.
23.25. «Раніцняя зорка» ў начным эфіры.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
7.50. «Дрэва жыцця». Дак. фільм.
8.40. Фальклор. «Невядомыя культуры».
9.10. Шэсць сотак.
9.30. «Прыгода ў каралеўстве». Мультфільм. 14-я серыя.
10.00. Аты-баты...
10.30. Тэлекрасворд. Забаўляльная праграма.
11.00. Студыя «Нотабене». «Зала чакання».
11.55. Манера.
12.25. Азы кар'еры.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. «Не высечы...» Вядучы У. Цветаў.
13.35. Студыя «Рост». «Гуфі-Гейм».
14.25. Нядзеля ў правінцыі. Архангельск.
15.10. «Дараэман».
15.25. Познер і Донах'ю.
15.55. У свеце жывёл.
16.55. Аванцэна. Рэжысёр Анатоль Эфрос.
18.10. Цэнтр Стаса Наміна (Эсэн-сі) прадстаўляе: клуб «Жоўтая падводная лодка».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Экспацэнтр прадстаўляе.
19.25. Фестываль класічных фільмаў Галівуда. «Набліжаючыя канец».
21.00. «Монстр». Прэм'ера дакументальнага тэлесерыяла (Расія—ЗША). Фільм 7-ы «Асабістае жыццё Іосіфа Сталіна».
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. «Я люблю РТВ». Анонс праграм Расійскага ТВ на снежань.
22.50. Чэмпіянат свету па бальных танцах.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

20 лістапада

Беларускае тэлебачанне

11.10. «Руская фантазія». Фільм-канцэрт.
16.30. «Гэты нягоднік Сідараў». Мастацкі фільм.
17.35. Без пяці 18.
18.05. Зімоўка дойнага статка. Перадача з Гродна.
18.25. «Туга». Кінанарыс.
8.45. «Мудрамер». Мастацкі фільм. 1-я серыя.
9.50. «Асенні матыў». Кінанарыс.
10.00. «Бярэсце». Літаратурна-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Ёга ў нашым жыцці. Перадача 1-я.
11.45. Дак. фільмы.
12.05. І. Кальман. «Сільва». Спектакль.
15.05. Рэспубліканскі чэмпіянат спартыўных танцаў.
16.20. Паміж намі, жанчынамі. Паліна, Іра і Людміла.
17.10. У стылі рэтра.
17.40. Рэклама.
17.45. Справы вайсковыя. Віцебская паветрана-дэсантная дывізія: гісторыя, сучаснасць, перспектывы.
18.30. Закрыццё II Міжароднага фестывалю «Адражэнне Беларускай капэлы». Частка 1-я.
19.10. Мультфільм.
19.25. «Аблачына-самабранка». Удзельнічаюць народны паэт Беларусі Р. Барадулін і народны пісьменнік Беларусі В. Быкаў.
19.55. Беларускія музычныя весткі.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Далёкія шатры» (Англія).
23.05. НІКа.
23.25. Канцэрт украінскага рок-спевака А. Цішчанкі.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Раніцняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. Шматсерыйны мультфільм «Бамсі» (Швецыя).
8.25. Экалагічны агляд.
8.40. НЛА: неаб'яўлены візіт.
9.10. Аўтограф па суботах.
9.40. Тэхнадром.
9.50. Медыцына для цябе.
10.30. Аховная грамата.
11.00. Справа.
11.10. Палітра.
11.40. Фільмы нашай памяці. «Аповесць аб першым каханні».
13.20. Мультфільм.
13.30. «Свабода выбару». Перадача 1-я «Улада рынку».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Шахматы без граніц.
15.35. «Змова. Тайна гібелі Джона Кенэдзі».
16.20. У свеце жывёл.
17.10. Чырвоны квадрат.
17.50. Мультфільм «Дракуліта-вампіраня» (Францыя).
18.15. Фільмы А. Міндадзе і В. Абдрашытава. «Спыніўся цягнік».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Брэйн рынг.
21.30. Пад знакам задыяка. Скарпіён.
23.00. Навіны.
23.20. «Снабачанне».

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.30. «Звоны». Фестываль перазвону ў Яраслаўлі.
8.00. «Размовы папросту». Перадача 1-я.
8.30. Праграма «03».
9.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
10.15. «Як жыць будзем?»
11.00. «Фініст — Ясны Сокал». Мастацкі фільм.
12.15. «Дом майстра, ці Фартуна доктара Дапертута».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. Зігзаг удачы.
14.20. Пілігрым.
15.05. «Бурда модэн» прапануе...
15.35. Непазнаны Сусвет.
16.05. Футбол без граніц.
17.00. Залатая шпора.
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Вуснамі дзіцяці.
18.15. Маскі-шоў.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. «Пейзаж в мабляй». Мастацкі фільм.
20.50. «Прытча аб рамонках». Мультфільм для дарослых.
21.00. Зусім сакратна.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Асарці.
23.00. Праграма «А».
23.30. Ад лібітум.
24.00. «Завяшчанне прафесара Доўэля». Мастацкі фільм.

21 лістапада

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.

ФІРМА
ПРАДАЕ
ЦУКЕРКІ
польскай
вытворчасці
дробным ці буйным
оптам.
Тэл. у Мінску:
60-33-11, 63-22-69.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін — 32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91. Тэлефакс: 32-22-03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 51.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 233.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

САМ САБЕ МЕТЭАРОЛАГ

Зіма: народныя прыкметы

У некалькіх выпусках «Хатняй энцыклапедыі» (з 22 мая па 3 ліпеня, 11 і 18 верасня) мы расказалі аб народных прыкметах, па якіх можна вызначыць надвор'е на бліжэйшы час улетку і восенню. Сёння мы прапануем нізку народных прыкмет на зіму, падрыхтаваных на старонках міні-кніжкі «Народныя прыкметы» выдавецтва «Ураджай».

● Калі зіма снежная, лета будзе дажджлівае.

● Калі зіма цёплая, лета будзе халоднае. І наадварот: калі зіма халодная, лета будзе цёплым.

● Калі зіма сухая, то і лета будзе сухое.

● Зімовыя завеі вядуць за сабой непагодлівае лета.

● Зара на ўзыходзе і захадзе сонца залацістая або светла-ружовая — да яснага надвор'я.

● Воблакі нізкія — да сцюжы.

● Шэрань на дрэвах, асабліва на бярозах — да маразоў, туман — да адлігі.

● Калі ноччу была шэрань, то днём снег не выпадзе.

● Моцная шэрань узімку — улетку будзе добры ўраджай.

● Шмат снегу на галінках — мала будзе ў лесе грыбоў і ягад.

● Снег глыбокі — будуць дажджы і добры ўраджай збожжавых летам.

● Доўгія сухія яловыя галінкі згінаюцца перад хуткай мяцеліцай, выпрамляюцца перад добрым надвор'ем.

● Вялікія камякі снегу — да працяглай непагадзі.

● Пушысты іней — да добрага надвор'я.

● Калі ўзімку на рацэ выступіць вада на лёдзе — то чакай адлігі.

● Гром узімку грыміць перад моцнымі вятрамі.

● Раніцай сонца чырвонае — да непагадзі.

● Зара раніцай і вечарам ярка-чырвоная — да перамены надвор'я.

● Сонца садзіцца ў хмару, над якой бачныя перыстыя або перыста-слаістыя воблакі — таксама да перамены надвор'я.

● Неба пад вечар зорнае — да марозу. Вакол месяца з'явіліся два цьмяныя чырванаватыя колцы — таксама перад моцнымі маразамі.

● Узімку чырвоны агонь у печы — да марозу, белы — да адлігі. Дровы ў печы моцна гараць і полымя гучна імкнецца ў комін — да буры. Попел у печы хутка патухае — перад адлігай. Дровы ў печы шыпяць, смуродзяць, кепска разгараюцца — да пацяплення.

● Узімку лес шуміць перад адлігай.

● Вясёлкавае кола вакол месяца — да вятроў, непагадзі.

● Белыя воблакі ўзімку — да марозу.

● Сонца садзіцца ў хмару — да бурану.

● Вакол сонца туманны кру